НЕ ЗАБУДЬ ПЕРАДАВАЙ ГАЗЕТУ НАСТУПНАМУ ЧЫТАЧУ
I-б. "Савецкая Беларусь" Москва, Москва, В Публичной библиотеке СССР им. Ленина отд. обнем. ст.

Пролетарыі ўсіх краёў, аднаўчайцеся!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПЯТНІЦА
20 лістапада 1931 г.
№ 268 (3357)

У бой за палепшаньне работы чыгункі

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, які адбыўся 12—16 лістапада, у ліку іншых важнейшых і чарговых пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва разгледзеў і пытаньне аб выкананьні дырэктыў партыі па чыгуначным і водным транспарце.

Пленум канстатаваў, што пры наяўнасьці некаторых вязначных палепшаньняў у рабоце транспарту, важнейшыя дырэктывы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР да гэтага часу яшчэ ня выкананы і работа чыгункі застаецца нездавальняючай. Тое, што чыгунка звяўляецца яшчэ вузкім месцам сацыялістычнай гаспадаркі, што тэмпы яе (чыгункі) перабудовы не адпавядаюць шпаркім бальшавіцкім тэмпам сацыялістычнай будоўлі наогул,—патрабуе ад усёй партарганізацыі і, у першую чаргу, ад партарганізацыі чыгункі самых уважлівых адносін, самага рашучага зьнішчэньня яшчэ маючыхся буйных прарываў на транспарце, самага неадкладнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і ўраду аб чыгунцы і выцякаючых з лістападаўскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б.

Партарганізацыі транспарту, яго гаспадарча-тэхнічны апарат, прафсаюзныя арганізацыі, калектывы рабочых і служачых транспарту, кожны транспартнік павінны зараз-жа сканцэнтраваць сваю ўвагу на ажыцьцяўленьне тых вузлавых рашаючых задач транспарту, аб якіх неаднаразова давалі дырэктывы партыя і ўрад. Гэткімі рашаючымі зьвеньнямі зьяўляюцца: барацьба за спараную язду, ліквідацыя абязьлічкі, правядзеньне пастановы партыі аб арганізацыі працы і ліквідацыі «лявацкай» ураўнілаўкі ў заработнай плаце, укараненьне гаспадарчага разьліку, узмацненьне працоўнай дысцыпліны.

Спараная язда на паравозах яшчэ і да гэтага часу ў значнай меры праводзіцца фармальна. Так на Віцебскім вузле за другую палову кастрычніка было 213 зрываў спаранай, па Жлобіне ў верасьні хадзіла 7 абязьлічаных паравозаў. Прычынай гэтага зьяўляецца, галоўным чынам, адсутнасьць бальшавіцкай барацьбы са зрывамі спаранай язды і з тым, што выклікае гэтыя зрывы. Гэткімі прычынамі зьяўляюцца: частыя масавыя перакідкі паравозаў, адсутнасьць графікаў работы паравозных брыгад, адсутнасьць сталага прымацаваньня і здачы паравозаў па актах і інш. Такія адносіны да важнейшай дырэктывы партыі, да загаду наркома шляхоў зносін тав. Андрэева ні ў якім разе цярпімы быць ня могуць. Уся партыйная арганізацыя і ў першую чаргу партарганізацыя транспарту, гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі, усе рабочыя і служачыя павінны зараз-жа, неадкладна ўступіць у бой, па-бальшавіцку змагацца за ўкараненьне сапраўднай спаранай язды, за павялічэньне сутачнай работы паравозаў ня менш чым на 1 гадзіну.

Другім рашаючым зьвяном барацьбы за сацыялістычны транспарт зьяўляецца поўная ліквідацыя абязьлічкі ў адносінах да вагоннага парку. Выкананьне дырэктыў партыі і загаду тав. Андрэева аб прымацаваньні пэўных паркаў да дарог і арганізацыя абменных пунктаў на чыгунцы БССР праводзіцца недапушчальна слабымі тэмпамі. Ня толькі няма энэргічнага выкананьня гэтай важнейшай дырэктывы, але ў радзе выпадкаў яшчэ і да гэтага часу існуе апартуністычны самацёк у гэтай справе. І гэта робіцца ня гледзячы на загад тав. Андрэева аб ліквідацыі абязьлічкі вагонаў у вызначаны тэрмін, які ўжо канчаецца. З усёй рашучасьцю трэба ўдарыць па тых апартуністах, якія затрымліваюць ажыцьцяўленьне гэтай важнейшай дырэктывы, якія працягваюць апартуністычную стаўку на самацёк.

Вынікам нездавальняючага праводзеньня спаранай язды, вынікам таго, што яшчэ не ліквідавана абязьлічка—процант хворых паравозаў і вагонаў на чыгунцы БССР застаецца яшчэ вялікім. Асабліва гэта мае месца ў дэпо Віцебск. Адсюль вынікаюць шматлікія папсаваньні паравозаў у пуці. У другім і трэцім квартале псаваньне паравозаў узрасло супроць першага кварталу. Гэта патрабуе ад транспарту неадкладнага наладжваньня ўсіх вытворчых працэсаў па рамонце паравозаў і вагонаў. Правільная расстаноўкай рабочай сілы, сапраўды бальшавіцкай работай па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў на самом транспарце, а таксама забясьпечаньнем дэпо неабходнымі запаснымі часткамі, будуць зьнішчаны прарывы ў гэтай справе.

Значна зацягнуліся і зусім не рашуча праводзяцца дырэктывы партыі аб арганізацыі працы і ліквідацыі «лявацкай» ураўнілаўкі ў заработку. Гаспадарнікі і прафсаюзныя арганізацыі на транспарце праяўляюць яўную недаацэнку рашаючай важнасьці правядзеньня прагрэсыўна-зьдольнай і прэміяльнай аплаты працы ва ўсіх зьвенях транспарту. «Лявацкая» ураўнілаўка ў зарпляце балюча б'е па наладжваньні работы транспарту. На Аршанскім вузле паміж рабочымі можна пачуць такія гуткі:—«Навошта мне стараца, калі ўсё, што атрымліваюць ударнікі, выдаецца і прагульшчыкам, і п'яніцам, і рвачом». Трэба зараз-жа і неадкладна, рашуча і па-бальшавіцку ажыцьцявіць дырэктывы партыі аб арганізацыі працы, аб ліквідацыі ўраўнілаўкі, аб правядзеньні прагрэсыўна-зьдольнай і прэміяльнай аплаты.

Дрэнна абстаіць і справа з працоўнай дысцыплінай на транспарце. Так, на Жлобінскім раёне ў другім квартале было 920 выпадкаў парушэньняў працдысцыпліны, а ў трэцім квартале гэта лічба ня толькі ня зьменшылася, але і вырасла да 938. На Гомельскім раёне ў другім квартале—1343 парушэньняў працдысцыпліны, у трэцім квартале—некалькі ніжэй, але таксама лічба вялізарная—1291 выпадак. На Віцебскім раёне ў жніўні было няявак на работу 501 чалавека-дзён, у верасьні—205. Гэта адбываецца таму, што шырокія масы рабочых не мабілізуюцца на рашучую барацьбу з парушэньнем працдысцыпліны, што зусім слаба ўкараняецца сапраўдная адказнасьць за даручаную ім работу, што зусім неадавальняюча праводзіцца праверка выкананьня, што з боку паасобных гаспадарнікаў яшчэ не праведзене на справе сапраўднае адзінаначальле. Дзе-ні-дзе яшчэ ня зьнішчана сямейсьцьвенасьць, асабліва сярод низавога адміністрацыйна - тэхнічнага складу дэпо і іншых зьвеньняў чыгункі. Партыйныя, прафсаюзныя арганізацыі, гаспадарнікі, рабочыя масы павінны завастрыць увагу на рашучай барацьбе за працоўную дысцыпліну, як адну з важнейшых і асноўных задач у рабоце транспарту.

Яшчэ да гэтага часу на транспарце фактычна адсутнічае асноўны рычаг правільнай арганізацыі транспартнай гаспадаркі—гаспадарчы разьлік. Нават больш таго, з боку раду гаспадарнікаў маецца апартуністычнае супраціўленьне і ігнараваньне гаспадарчага разьліку. Гэтаму неабходна зараз-жа і рашуча пакласьці канец.

Дрэнна абстаіць справа з забясьпечаньнем рабочых-чыгуначнікаў, з палепшаньнем грамадзкага харчаваньня. Зусім нездавальняюча становішча жыльлёвых і бытавых умоў рабочых-чыгуначнікаў і недастатковая ўвага да гэтага гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый, слаба абстаіць справа і ў падрыхтоўцы і правільнай расстаноўцы кіруючых кадраў, асабліва ў нізавых зьвеньнях. Яшчэ да гэтага часу партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі цалкам не перабудавалі сваёй работы тварам да цэху, зьмены і брыгады, не наладзілі апэрацыйнага дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва і штодзённай дапамогі нізавым парт. і прафарганізацыям, не дамагліся аўладаньня тэхнікай.

Перад транспартам зараз стаяць вялізарнейшыя задачы ў выкананьні плянаў асеньня-зімовых перавозак, ад чаго ў значнай ступені залежаць посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва. Усё гэта патрабуе нухільнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і ўраду аб транспарце, выкананьня 6 умоў тав. Сталіна, якія зьяўляюцца асноўным рычагом у барацьбе за палепшаньне работы транспарту.

„Разьвіць у поўную работу арганізацыйна-гаспадарчым узмацненьні калгасаў" (ЦК УсеКП(б)

Разьмеркаваньнем даходаў па працаднёх

нанясём руйнуючы ўдар па дробнабуржуазнай уладкунілаўцы, спажывецкіх настроях, узьнімем на вышэйшую ступень калгасную вытворчасьць

Адстаючыя калгасы!—раўняйцеся па калгасе „Чырвоная Зорка", які па-бальшавіцку правёў папярэднее разьмеркаваньне ўраджаю

Ісьці ў нагу з калгасам „Чырвоная Зорка"

Шклоў. Калгас «Чырвоная Зорка, Чарнаруцкага с.-с., арганізаваўся ў 1931 г. з 12 гаспадарак. Зараз калгас налічвае ўжо 63 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У рабоце калгасу ўведзе на зьдзельшчына, нормы выпрацоўкі лепшыя калгаснікі-ударнікі перавыконваюць. Калгас ужо правёў прыкладнае разьмеркаваньне даходаў.

Валавы збор прадукцыі ўраджаю ад усіх культур у калгасе складае 8.768,3 цнт. У пасеўны і насенна-страхавы фонды вызначана 1.338,41 цнт. У фуражны фонд вызначана 4.693,76 цнт.

Увесь прыбытак калгасу (ураджай і інш. набочныя даходы) складаюць 31,928 руб. 49 кап. З гэтага прыбытку адлічана ў абавязковыя плацежы (па падатак, страхоўка) 2.475 руб.

Пасьля адліку ад агульнага даходу ў абавязковыя плацежы, зроблена ад лічэньне ў недзялімы і грамадзкі фонд на суму 6.774 руб. 25 кап.

У першую чаргу калгас здае дзяржаве ліпкі (жыта, ячмень, бульба і г. д.) на суму 17.552 руб. 34 кап. Калгас ужо здаў дзяржаве збожжа на суму 3.129 руб. 45 кап.

Для таго, каб вылічыць расцэнку ад нятго дня, калгас улічыў увесь лік працадзён, выпрацаваных з 1-I—31 г. на 1-X—31 г. і лік працадзён, якія калгаснікі павінны выпрацаваць яшчэ да 1-I—32 г., шта складае ўсяго 21.649 працадзён. На адзін працадзень калгасьніка будзе прыпадаць 506 гр. хлеба і пшаніцы, 586 гр. гароху і ячменю; 10,35 кілё бульбы, 1,110 грам сена, 1,246 грам саломы і 37,5 кап прыбытку.

І ў выніку выйшла, што адна сям'я калгасьніка яны адным працаздольным атрымае куды больш, чым сям'я аднаасобнай гаспадаркі. Так, сям'я калгасьніка Казлова Парфёна (бедняка да паступленьня ў калгас), якая складаецца з чатырох працаздольных і шасьці непрацаздольных атрымлівае: харчовая частка—126,87 цнт., кармовая частка—26,19 цнт., грашовая частка—431 р. 13 кап.

Сям'я Шчэрба М. (серадняк да паступленьня ў калгас), маючы тры працаздольных члены і тры непрацаздольных, атрымлівае: харчовая частка—113,93 цнт., кармовая—23,54 цнт. і грашовая—395 р. 96 кап., апроч гэтага Шчэрба яшчэ атрымае на абагуленую маемасьць.

Гэтыя факты і лічбы яскрава паказваюць перавагу калектыўнай гаспадаркі. Усе іншыя калгасы павінны ісьці ў нагу з калгасам «Чырвоная зорка»

П. Шклоўскі.

Том, дзе арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў не паспетаўлена ў цэн р урагі

Правядзеньне папярэдняга разьмеркаваньня ўраджаю ў калгасе «Перамога», Княжыцкага сельсавету, Шклоўскага раёну, недастаткова скарыстана для мабілізацыі калгаснікаў на арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасу.

Зьдзельшчына ў гэтым калгасе ўведзена толькі фармальна, якасьць і нормы выпрацоўкі калгаснікаў ня ўлічваюцца. Паляводы і брыгадзіры калгасу не ганяцца на нормы выпрацоўкі, а пішуць кожнаму калгаснику па прагадню. Працдысцыпліна з кожным днём зьнижаецца.

Брыгадзір адзьзленьня калгасу імя Сталіна дае зьвесткі ў праўленьне аб выпрацаваных працаднёх калгаснікамі толькі за месяц. У вучоце працы поўная блытаніна.

Папярэдняе разьмеркаваньне ўраджаю прайшло на кулацкім прынцыпе. Так, жыта раздал калгаснікам не па працаднёх, а на едакох.

Адстаючыя калгасы не скарысталі вопыту прыкладнага калгасу Шклоўшчыны «Чырвоная Зорка», дзе разьмеркаваньне ўраджаю праводзілася пад лазунгам «хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае».

Зробленыя памылкі пры разьмеркаваньні ўраджаю, павінны быць выпраўлены. Раённым арганізацыям Шклоўшчыны неабходна забясьпечыць калгас апэрацыйным кіраўніцтвам разьмеркаваньне ўраджаю, каб правесьці ў жыцьцё пастановы партыі і ўраду аб гаспадарча-арганізацыйным замацаваньні калгасу.

П. Хвойнік.

У пагоні за дутымі лічбамі калектывізацыі

Ня гледзячы на рад пастаноў партыі і ўраду аб арганізацыйным замацаваньні калгасаў, Старобінскія раённыя арганізацыі працягваюць гнаціца за дутымі лічбамі калектывізацыі, не зьвяртаючы ўвагі на замацаваньне існуючых калгасаў.

У самым старэйшым раёне калгасе «Прамень Камуны», які налічвае 147 гаспадарак, на сёньняшні дзень адсутнічае вучот працы, пануе падзёншчына. Як вынік, калгас да гэтага часу ня здолеў убраць бульбу і кормаплоды. З 22 га разасланых лён перапляжаў і да гэтага часу не падняты.

Збіжэ больш грубыя памылкі зроблены пры разьмеркаваньні ўраджаю. Складзены хлеба-фуражны баланс калгасу зьменшаны, ураджайнасьць штучна зьнижана. Так, напрыклад, па кавана, што з 1 га сабрана бульбы 66 цэнтн., а фактычна сабрана 83 цэнтн. Агульны баланс збору бульбы памен шаны на 2074 цэнтнэры.

Праўленьне калгасу трымае курс на перашчарголае самазабясьпячэньне. Так, з вызначанага па плану здачы дзяржаве, здана толькі: зярнёвых 85,07 цэнт. або 34 проц., бульбы 80 цэнт. або 5,5 проц., а астатняя прадукцыя разьмеркавана сярод калгаснікаў. Члены партыі Холад С. і Кравец працягваюць разазьняні аб неэканомнасьці і немагчымасьці выкананьня плянаў здачы (продажу) дзяржаве збожжа.

Зьдзельшчына ў рабоце калгасу не праводзіцца, з 352 працаздольных членаў калгасу на работу выходзяць 70-80 асоб.

Пры разьмеркаваньні ўраджаю рай калгасаўз даў паказаньне калгасам аб забясьпячэньні прадуктамі (вылучыць асобны фонд) для непрацаздольных. А такіх «непрацаздольных» у калгасе некалькі дзесяткаў.

Трэба ў бліжэйшы час пераключыцца ўсім арганізацыям на арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў.

Юрка Свой.

Калгас „Перамога" ў кулацкім палоне

У калгасе імя Варашылава і «Перамога», Старасельскага сельсавету, Талачынскага раёну, разьмеркаваньне ўраджаю праходзіць па прынцыпу кулацкай ураўнілаўкі. Старшыня калгасу «Перамога» раздаў калгаснікам каля 296 пуд. хлеба, а дзяржаве здаў (прадаў) усяго 18 пуд., газорачы: «да волі будзе і дзяржаве». Раздача гэтага збожжа праходзіць так, што лепшы ўдарнік атрымаў навоўне з гультаём. Зьдзельшчына ў рабоце калгасу адсутнічае, вучот работы калгаснікаў не праводзіцца. Замест заліку працаднёў ставяцца «палачкі».

Трэба назаўсёды скончыць з кулацкай ураўнілаўкай у калгасах. Сельсавет і партыйчэйка павінны пераключыцца на ўдарную работу па разьмеркаваньні ўраджаю. Учынят разьбіць кулацка-спажывецкія настроі.

Я. Каган.

24-га лістапада—даклад тав. СОЛЬЦА
на нарадзе газэтных работнікаў

У аўторак 24 лістапада а 6 гадз. увеч. у памяшканьні Малай Залі ЦК, Культпроп ЦК КП(б)Б
СКЛІКАЕ ЧАРГОВУЮ ІНСТРУКЦЫЙНУЮ НАРАДУ
камуністаў рэдактораў фабр.-заводзкіх шматтыражак Менскага, а таксама рэдактараў фабр.-заводзкіх шматтыражак Камвузу, а ўдзелам студэнтаў 2 га курсу газэтнага аддзяленьня Камвузу

На абвешчаны дзень: 1. Даклад члена президыуму ЦК УсеКП(б) т. А. Сольца. 2. Паведамленьні „Работа оргнаў контрольных камісій і задачы друку". „Савецкая Беларусь", „Рабселькор", „Сельскі с. рабочы Беларусі", рэдакцый газэт—„Калгаснік Беларусі", „Чырвоная Зьвязда", „Рабочы", „Акцябр", рэдакцый газэт аб газэтных мерапрыемствах гэтых рэдакцый па арганізацыі і разьвіцьцю рэсэсэзнага конкурсу нізавых газэт, якія абвешчаны «Правдой».

Культпроп ЦК КП(б)Б.

Я онска-кіта скі канфлікт

Японское войска абстрэльвае Цыцыкар

Кітайскае войска генэрала Ма эвакуіруецца з Цыцыкару

Войска Ма адступае

ТОКІЁ. 18. Па паведамленьню Сімбун Ренго з Мукдэна, японскія войскі 18 лістапада раніцою нанесьлі рашучае паражэньне войскам Ма адступіўшым да Цыцыкару. Японскія войскі прасьле дуючы адступаючыя кітайскія войскі, паведамляе агэнцтва, відавочна займуць Цыцыкар сягоньня, або заўтра раніцай.

„Пасылка новых японских войск у Манчжурыю неабходна"—так прызнаў савет міністраў

ТОКІО. 18. Як паведамляе «Асахі» савет міністраў, пазнаёміўшыся сёньня з дакладам Мінамі (ваенны міністр) прызнаў наступнае:

1. Дзеяньні генэрала Ма недапушчальны, і Японія павінна прыняць адпаведныя рашэньні ў адносінах да Ма;

2. Неабходна апублікаваць сёньня-ж дэклярацыю, зьверненую да ўсяго сьвету для растлумачэньня таго, што Японія ня хоча вайны, аднак, прымушана ўжыць падобныя меры ў мэтах самаабароны;

3. Так як нядаўныя японскія сілы ў Манчжурыі недастатковы то зусім магчыма, што ўзьнікне неабходнасьць пасылкі новых папаўненьняў з самой Японіі.

***

ТОКІЁ. 18-XI. Паводле паведамленьня Сімбун Рэнга з Харбіну японскаму войску ўдалося нібы абкружыць левы флянг войска Ма і такім чынам пашкодзіць магчымасьць адступленьня ў напрамку да Харбіну. Войска Ма адагнаны згодна гэтых паведамленьняў да захаду ад ракі Нонні. Генэрал Ма са штабам накіраваўся нібы на поўнач праз Цыцыкар.

Японія заказвае ваенныя аэропланы ў Англіі

ЛЕНДАН. 18. «Дэйлі Геральд» паведамляе, што фірмай «Ролло Рэйс» атрымана тэрміновая тэлеграма з Японіі з просьбай указаць у які бліжэйшы тэрмін кампанія можа даставіць у Японію авіяцыйныя маторы магутнасьцю у 825 конскіх сіл.

Японія адхіляе просьбы ген. Ма

МУКДЭН. 18-XI. Паводле паведамленьня з японскіх ваенных колаў, сёньня генэрал Ма накіраваў генэралу Ханцю адказ наступнага зьместу: 1) я эвакуюю свае войска ў тым выпадку, калі Японія першай вывядзе свае войска, 2) калі японцы дадуць пэўную гарантыю, што войска Чан-Хай-Фен ачысьцяць Таонань-Японцынскую чыгунку, а іх войска ня будзе перашкаджаць руху па гэтай дарозе Прадстаўнік японскіх ваенных колаў, каментуючы адказ генэрала Ма зазначыў: «мы поўна адхілім гэты адказ, што выклікала вялікае зьдзіўленьне замежных карэспандэнтаў, якія лічуць, што адказ генэрала Ма створыць прадпасылкі для таго, каб пачаць з імі перагаворы і дасягнуць кампрамісу».

Нанкін „пратэстуе"

ШАНХАЙ. 15-XI. Нанкінскі ўрад накіраваў у Лігу нацый яшчэ адну заяву, у якой заначаецца, што японцы прымусілі ў Мукдэн бягучага мандарына Пу-І з мэтай стварэньня мандарынскага ўраду. Нанкінскі ўрад паведамляе дзяржавы, што калі такі ўрад будзе створан, дык Кітай будзе расцэньваць яго як «нядзейны ўрад», арганізаваны японцамі, і што таму, адказнасьць за дзеі гэтага ўраду ляжа на Японію.

***

ШАНХАЙ. 18-XI. Нанкінскі ўрад прыняў адстаўку губэрнатара Хэйду цзянскага ўраду Ван-Фу-Ліна і назначыў замест яго генэрала Ма.

***

МУКДЭН. 18-XI. Японская ваенная ўлада паведамляе, што кітайцы адагнаны з перадавой лініі і адступаюць у непарадку. Паводле гэтых паведамленьняў перадавая лінія японскага войска недалёка УК чыгункі. У раніцы ідуць жорсткія бае. Маюцца па раненыя з абодвых бакоў.

***

БЭРЛІН. 18-XI. Як паведамляюць з Амстардаму, 16 лістапада рабочыя 2-х тэкстыльных фабрык абвесьцілі забастоўку супроць 10 проц. зьніжэньня заработку, якая закранае 16 тысяч рабочых.

ГЭРОЙ ДНЯ

Францыя адкрыта падтрымлівае японскіх імпэрыялістаў—акупантаў Манчжурыі як «фактар парадку раўнавагі на Далёкім Ўсходзе (з газэт).

Паклонынін «Рыцарскай адвагі»
«Пан-Эўрапэйскі» гад
Вітае «фактар раўнавагі»
Пад вой гармат.

Вітае майстраў правакацыі
І рад не рад
Гульню зрывае у Лізе-Нацыі
У маскарад...

Забастоўка варшаўскіх трамвайшчыкаў пашыраецца

Манэўры сацыял.-фашыстаў сарваць забастоўку не ўдалося. Бурныя мітынгі. Да бастуючых далучыўся газавы завод

ВАРШАВА. 18-XI. Учора на паседжаньні Варшаўскага магістрату абгаварвалася пытаньне аб забастоўцы трамвайшчыкаў. Некалькі згодніцкіх прафсаюзаў выступілі на паседжаньні з «гарачымі прамовамі» за падтрыманьне патрабаваньняў рабочых. Прад стаўнікі делегацыі трамвайных рабочых ня былі выслуханы на паседжаньні. Бездакладна выявілася, што за сыйной гэтых сапраўдных прадстаўнікоў бастуючых, якім было даручана сачыць за дзеямі прафбюракратаў, сацыял-жандарматы стараюцца сарваць забастоўку.

Прэзыдэнт гораду (старшыня магістрату) Гаміцкі даў спраўку, што прафсаюзныя правадыры яшчэ а 2 га дзіне дню мелі нараду ў міністэрстве працы аб тым, як лепш ліквідаваць стачку. Да 9 гадзіны ўвечары, г. зн. да часу адкрыцьця паседжаньня магістрату яны падпісалі пратакол аб ліквідацыі канфлікту на рашэньне ўрадавага арбітражу.

Згодніцкі прыхільці патрабаваньне ін спэктара працы аб бездакладным спыненьні забастоўкі. Прадстаўнікі магістрату ў сваю чаргу «абяцаюць» ня ўжываць у лістападзе закону зьнижаю чага зарплату. У сувязі з гэтым прэзыдэнт гораду прапанаваў магістрату ўстрымацца ад прыняцьця рэзалюцыі. Аднак, магістрат зразумеў тонкія манэўры прафсаюзнікаў і для палягчэньня «прадукцыйнай» работы прыняў ушчасьці «пакаяньня» прапанову задаволіць патрабаваньні рабочых на ўводзіны чэрвеньскіх ставак.

Сёньняшнія газэты заначаюць, што рашэньне думы не зьмяняецца прыймальна для магістрату і ня можа быць праведзена ў жыцьцё ў сувязі з фінансавымі труднасьцямі гарадзкога самакіраваньня.

Сёньняшнія раніцкія газэты у прыватнасьці «Работнік» выйшлі з апісаньнямі, якія апавяшчаюць аб ліквідацыі забастоўкі трамвайшчыкаў, аднак, на самай справе курсуюць толькі пяць аўтабусаў, ахоўваемыя паліцэйскімі. Ніводзін вагон трамваю ня выйшаў.

Учора ўвечары, дзе зьмяшчаецца саюз моталёўцаў адбыўся мітынг трамвайшчыкаў, на якім прынята рэзалюцыя аб працягваньні забастоўкі. Вячорнія газэты тлумачаць факт прапаваньня забастоўкі тым, што старшыня магістрату і прэзыдэнт гораду адмовіўся зацьвердзіць учэрайшае рашэньне магістрату і ня прыняў сёньня раніцой делегацыі, якая дамагалася пісьмовага абавязацельства аб увядзеньні чэрвеньскіх ставак.

Паводле апошніх паведамленьняў да забастоўкі трамвайшчыкаў далучыліся рабочыя газавага заводу, два вучасткі грамадзкіх работ і адзін з гарадзкіх шпіталей. Арыштаваны ўчора на дэманстрацыі трамвайшчыкаў камуністычны дэпутат Рожэк, зьбіты паліцыяй, быў вызвалены сёньня раніцой «пасьля засьведчаньня асобы».

Сёньня раніцой па вялікім мітынгу трамвайшчыкаў зноў прынята рэзалюцыя—забастоўку працягваць. Прафбюраграты спрабаваўшыя апраўдаць сваю палітыку былі асьвістаны і сагнаны з трыбуны.

Аб'ядкаду правядзеньня месячніка па пераішапачатковай апрацоўцы і здачы прадукцыі лёну і канапель

У ім РК КП(б)Б

На падставе пастановы ЦК (апублікаванай у газэце «Зьвязда» ад 1-XI-31 г.) РК КП(б)Б і КСМ, фр. РВК, райкалгасаюзам, партчасткам МТС і загатоўчым арганізацыям, ЦК прапануе ажыцьцявіць наступныя мерапрыемствы:

1. Абгаварыць пастанову ЦК аб першапачатковай апрацоўцы лёну і канапель на паседжаньні РК, ячэек КП(б)Б і КСМ, правесьці раённыя нарады сакратароў партыйных і камсамольскіх ячэек, старшынь сельсаветаў і калгасаў, раённага партыйнага, саветскага і канпэрацыйнага актыву, дзе распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па выкананьні пастановы ЦК КП(б)Б.

2. Райкомам КП(б)Б і ячэйкам разгарнуць шырокую агітацыйна-масавую работу сярод калгаснікаў і калгаснік, рабочых саўгасаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў, шляхам абгаварэньня рашэньня ЦК на праўленьнях калгасаў і агульных сходах калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў.

3. Абгаворваючы практычныя мерапрыемствы па выкананьні пастановы ЦК і мясцовых партарганізацый сярод рабочых саўгасаў, калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў - аднаасобнікаў, праводзіць практычную работу па перавозе лёнаводных калгасаў на зьдзельшчыну, арганізаваць сацспабораніцтва паміж асобнымі раёнамі, калгасамі, вёскамі і брыгадамі калгасьнікаў і аднаасобнікаў, а таксама ставіць у калгасах і саўгасах ударныя брыгады па апрацоўцы экспортнага лёну, забясьпечыць удзел усіх калгасаў, МТС, саўгасаў у правядзімым конкурсе на лепшую апрацоўку і здачу дзяржаве лёнавалакна і пянькі (абвешчана ў газэце «Зьвязда», № 254).

4. РК і ячэйкі КП(б)Б і КСМ, фр. РВК, райкалгасаюзы і МТС павінны зараз-жа вызначыць тых лёназаводы, з якімі калгасы, саўгасы і МТС будуць заключаць сацдагаворы, правесьці сутольныя нарады, дзе і распрацаваць канкрэтныя абавязацельствы з перанясеньнем дэталёвай выпрацоўкі і заключэньня сацдагавораў на сходы рабочых саўгасаў, калгаснікаў, рабочых МТС і аднаасобнікаў. Сацдагаворы павінны прадугледзець аказаньне дапамогі з боку прамысловасьці калгасам, саўгасам і МТС, шляхам інструктаваньня аб мэтадах лепшай першапачатковай апрацоўкі лёну, пасылкі рабочых брыгад і г. д. З другога боку калгасы, саўгасы і МТС павінны па дагаворах з прамысловымі прадпрыемствамі прыняць абавязак на свачасовай апрацоўцы лёну і канапель і да тэрміновай здачы (продаж дзяржаве), а таксама прадугледзець добраякасную здачу сыравіны.

5. Фракцыі РВК, РККР-РСІ і райкалгасаюзу, загатоўчым арганізацыям зараз-ж скласьці брыгады з прадстаўнікоў РВК, РККР-РСІ, райкалгасаюзаў, саўгасаў, калгасаў і МТС і загатоўчых арганізацый, якія павінны правесьці наступнае:

а) падрыхтаваньне ў кожным калгасе мяльня-сушыльных пунктаў і будаўніцтва новых, прыстасаваньне ўсіх сушыў, лазьняў для сушкі і мяцьця трасты і канапель, забясьпечаньне лёнасушыльных мяльных пунктаў, мабілізацыю простых мялак, забясьпечаньне апаланы, газай, лямпамі, кнатамі і інш. Гатоўнасьць лёназаводаў па прыёмцы трасты, а таксама свачаснае пуск заводаў, арганізуючы дапамогу калгаснікам у свачасовым скончэньні будаўніцтва заводаў;

б) Арганізаваньне брыгад па мяцьці, сушцы і трапаньні трасты, давядзеньне да кожнай брыгады нормы выпрацоўкі, дакага заданьня па перапрацоўцы трасты ў гатовае ільнавалакно і пяньку, зьнішчыць абязьлічку праз прымацаваньне да брыгад кінвентара. На чале брыгад небходна ставіць калгаснікаў-ударнікаў правяўшых сябе ў веснавую, уборачную кампанію па пасеву і ўборцы лёну, РК, фр. РВК, райкалгасаюзам, МТС забясьпечыць ля менш 2-х зьмянную кампэрную брыгадную работу па апрацоўцы лёну і канапель.

в) Давядзеньне плянаў перапрацоўкі да кожнага калгасу і плянаў здачы ільнавалакна і пянькі дзяржаве, складаньне рабочых календарных плянаў па-за заводзкай працоўкі лёну і канапель і шырокага абгаварэньня сярод калгаснікаў, калгасьніц вызначаных норм выпрацоўкі. Давядзеньне плянаў да вёсак і двара ў парадку самабавязацельства, зьвярнуўшы асабліва сур'ёзную ўвагу на праверку выкананьня цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі.

6. Разгарнуць шырокую масава-арганізацыйную работу па мабілізацыі мас калгаснікаў, калгасьніц, беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў на правядзеньне чырвоных абозаў, забясьпечыўшы бесперабойны прыём валакна, пянькі, выдачу прамтавараў, разстаўшы сілы так, каб не дапусьціць ніякай затрымкі ў часе прыёмкі прадукцыі на пунктах.

7. У мэтах атрыманьня лепшай якасьці ільнавалакна і пянькі павесьці працу сярод калгаснікаў, калгасьніц, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў за свачасовы пад'ём трасты для лепшай якасьці выпрацоўкі ільнавалакна і здачы трасты на завод. Неабходна шырока папулярызаваць і правесьці ў жыцьцё пастанову НКЗ БССР і Белкалгасцэнтру аб арганізацыі працы мяльшчыкаў, трапальшчыкаў і сушыльшчыкаў.

8. Пры арганізацыі апрацоўкі лёну і канапель і здачы бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі разгарнуць працу па ўзаемадапамозе калгасам з боку аднаасобнікаў беднякоў і сераднякоў і наадварот. Шырока растлумачыць ільготу пасеўшчыкам лёну і канапель, згодна пастановы ЦК ад 22-IX—31 г.

9. На ўсіх прыёмачных пунктах забясьпечыць культурна-масавае абслугоўваньне калгаснікаў, калгасьніц, беднякоў і сераднякоў (радыё-гутаркі, кіно, літаратура, пытаньні і адказы), арганізаваўшы сустрэчу чырвоных абозаў на гэтых пунктах.

10. Скласьці брыгады з прадстаўнікоў ЦКК-РСІ кіраўнік брыгад, НКЗ і рэдакцый «Зьвязда», «Савецкая Беларусь», «Калгаснік Беларусі», якім правяць на працягу дэкады выкананьне пастаноў ЦК і ўраду па прасоўваньні прамтавараў, па стымуляваньні апрацоўкі і загатоўкі лёну і канапель і снабжэньні хлебам пасеўшчыкаў і здатчыкаў.

11. Сэктару друку культпропу ЦК правесьці нараду прадстаўнікоў рэдакцый цэнтральных газэт па распаўсюдзе практычных мерапрыемстваў па выкананьні пастановы аб ільнаагатоўках з боку цэнтральных і мясцовых газэт.

12. У бліжэйшы час заслухаць даклад 3-х сакратароў райкомаў аб ходзе першапачатковай па-за заводзкай апрацоўкі лёну і канапель і здачы прадукцыі дзяржаве.

13. Для практычнага кіраваньня месячнікам скласьці штаб з прадстаўнікоў агітмасавага аддзелу ЦК, НКЗ, Наркамсобзу, рэдакцыі «Зьвязда» і ЦК ЛКСМБ. Райкомам КП(б)Б стварыць раённыя штабы па кіраваньні практычнай работай па правядзеньні месячніка.

ЦК КП(б)Б.

Усім гаркомам і райкомам КП(б)Б. Катэгарычна прапануецца ГК і РК у раёнах якіх створаны сельпартномы, тэрмінова дасласць у ЦК КП(б)Б зьвесткі аб сельпартномах, згодна разасланай праграмы.

За „Чырвоную кнігу саветаў“

Арганізаваць штодзённую праверку,

як выконваецца праграма-мінімум арганізацыямі, якія ўключыліся ў сацспаборніцтва

Як сельсаветы змагаюцца за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў,

гарсаветы вядуць барацьбу за выкананьне прамфінпляну, за ўзьлым гарадзкой гаспадаркі,

друк арганізоўвае масы вакол спаборніцтва саветаў, як праводзіць конкурс „Правды“

ПРАВЕСЬЦІ КОНКУРС „ПРАВДЫ“ НА ЛЕПШУЮ ГАЗЭТУ САЎГАСУ, КАЛГАСУ і МТС

Сацыялістычнае спаборніцтва саветаў БССР за стварэньне «ЧЫРВОНАЙ КНІГІ» ня можа праходзіць бяз удзелу раённага і нізавога друку і арміі рабсельваенкораў.

Газэта «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ», якая ўключылася ў свой час у конкурс абвешчаны «ПРАВДОЙ» для нізавога друку на лепшае правядзеньне арганізацыйна гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, ЗАКЛІКАЕ ўсіх сваіх рабрабсельвораў арганізаваць шырокія масавыя рэйды па праверцы як нізавы друк змагаецца за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за выяўленьне лепшай газэты, якая праводзіць конкурс «ПРАВДЫ, якая арганізоўвае масы на правядзеньне сацспаборніцтва, за перабудову работы саветаў, за стварэньне «ЧЫРВОНАЙ КНІГІ».

Сацспаборніцтва Менск—Віцебск

Пастанова прэзыдыуму Менскага гарадзкога савету аб сацыялістычным спаборніцтве за месяц ў „Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартоў саветаў“

Прэзыдыум Менскага гарадзкога савету, абгаварыўшы выклік Віцебскага гарсавету і, кладучы ў аснову праграму-мінімум для гарадзкіх саветаў па ўключэньні ў «Чырвоную кнігу сацыялістычных рапартоў саветаў»,— прымае гэты выклік і бярэ на сябе наступныя абавязацельствы.

1. Неадкладна прыступіць і не пазьней як у другой палове сьнежня скончыць ва ўсіх сэкцыях і дэпутацкіх групах распрацоўку ліста ЦК ЦКК КП(б) і ЦСПСБ «аб мерах прыцягненьня шырокіх рабочых мас у савецкі апарат»—намеціць і правесьці практычныя мерапрыемствы па ажыўленьні і ўзмацненьні работы дэпутацкіх груп і сэкцый гарсавету.

2. Не пазьней 1-га сьнежня ўвесьці сацсумяшчальнікаў у адпаведныя сэкцыі гарсавету ў якасьці нам. старшынь сэкцый, дамагчыся размеркаваньня іх ад іншых нагрузак і складзьці адпаведныя ўмовы работы іх у апараце, ажыцьцяўляючы сталы нагляд і практычную дапамогу ў рабоце сацсумяшчальнікаў.

3. Да канца сьнежня давесьці колькасьць добраахвотнікаў у сэкцыях гарсавету ня менш 700 чалавек, галоўным чынам, за лік ударнікаў і ўдарніц прадпрыемстваў, інжынэрна-тэхнічнага персаналу, студэнтаў, урачоў і настаўнікаў; адначасова ажывіць работу сэкцый, устанавіць сталую праверку і дапамогу ў рабоце, практыкуючы перыядычнае заслухоўваньне дакладаў і брыгадзіраў сэкцыі.

4. Не пазьней як да 15 сьнежня правесьці абсьледваньне работы дэпутацкіх груп і адначасова дапамагчы групам у перабудове іх работы. Склікаць нараду бюро груп і ў далейшым наладзіць сыстэматычнае кіраўніцтва ў напрамку паваротy дэпутацкіх груп тварам да выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну і палепшаньня культбытавога абслугоўваньня рабочых.

5. Не пазьней як да канца сьнежня ахапіць усе дэпутацкія групы і сэкцыі гарсавету сацыялістычным спаборніцтвам, наладзіць сыстэматычную праверку выкананьня прынятых абавязацельстваў, а таксама арганізаваць вучоў работы дэпутацкіх груп і сэкцыі гарсавету і кантроль за выкананьнем пастаноў гарсавету і яго сэкцыі.

6. У мэтах праверкі ходу выкананьня прынятых самаабавязацельстваў сумесна з рэдакцыяй газэты «Савецкая Беларусь» арганізаваць да канца сьнежня мясяца 1931 г. рэйды па праверкі па перабудове работы дэпутацкіх груп, сэкцый гарсавету і па мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

7. Для прэм'яваньня лепшых сельсаветаў, сэкцый і дэпутацкіх груп, а таксама лепшых членаў гарсавету, сельсавету, сэкцый і дэпутацкіх груп вызначыць спэцыяльны прэм'яваньны фонд у разьмеры 3.000 рублёў.

Сёньня, 20 лістапада, у рэдакцыі газэты «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» склікаецца кантрольная нарада ўсіх студэнтаў інстытуту савецкага будаўніцтва, якія прымацаваны да дэпутацкіх груп г. МЕНСКУ.

Пачатак нарады роўна а 5 гадзіне ўвечары, у пакоі сэктару савецкага будаўніцтва.

Перабудаваць работу гарадзкіх саветаў

Мазыр выклікае Рэчыцу на сацспаборніцтва

У пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, баявых тэмпаў па фарсаваным будаўніцтве прамысловасьці і ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, роля і адказнасьць саветаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту, па мабілізацыі мас вакол задач сацыялістычнага будаўніцтва значна ўзрастаюць. Задачы стаячыя перад рабочай клясай у 3 рашаючым і 4 завяршальным годзе пяцігодкі, патрабуюць больш рашучага павароту саветаў тварам да вытворчасьці, тварам да рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Выходзячы з вышэйпаказаных задач і пастановы пленуму гарсавету, пашыранага пленуму сэкцый гарсавету і дэпутацкіх груп аб уключэньні ў сацспаборніцтва за месяц ў «Чырвонай кнізе» Мазырскі гарсавет пастанаўляе выклікаць на сацспаборніцтва Рэчыцкі Гарсавет за права быць занесеным у «Чырвоную кнігу саветаў».

За стварэньне „Чырвонай кнігі саветаў“

1. Распрацаваць ліст ЦК ЦКК і ЦСПСБ ад 9 кастрычніка аб мерах прыцягненьня шырокіх рабочых мас у работу саветаў і намеціць мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні і ўзмацненьні работы сэкцый і дэпутацкіх груп.

2. Сэкцыям і дэпутацкім групам садзейнічаць у рабоце сацсумяшчальнікаў і мець штодзенны нагляд за іх работай, дабіцца поўнай разгрузкі іх ад іншых нагрузак і ўвязаць работу сэкцый з сацсумяшчальнікамі шляхам увядзеньня ў бюро сэкцыі ў якасьці намесьніка старшыні сэкцыі - сумяшчальніка адпаведнага аддзелу.

3. Ліквідаваць абязьлічку ў сэкцыях шляхам даручэньня кожнай работы пад адказнасьць таго ці іншага члена сэкцыі, альбо актывіста. Пры нявыкананьні ў тэрмін даручэньня, альбо за адказ ад даручанага заданьня ставіць пытаньне аб такіх членах сэкцыі на бюро сэкцыі. Усклаці адказнасьць за работу брыгады на старшага брыгадзіра і пэрыядычна заслухоўваць старшынь брыгад аб іх рабоце.

4. Ахапіць усіх членаў сэкцый і актывістых нагрузкамі з мэтай ўхіленьня адсеву актыву.

5. Абавязуемся праз правядзеньне растлумачальнай работы сярод рабочых, правесьці вярбоўку для работы ў сэкцыях ня менш як 100 чал. рабочых, служачых, студэнтаў і жонак рабочых.

6. Ліквідаваць абязьлічку ў рабоце дэпутацкіх груп, усклаўшы на кожнага члена групы пэрсанальную адказнасьць за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну ва ўсіх яго паказчыках і палепшаньня матар'яльна-бытавога становішча рабочых па месцы працы дэпутата.

7. Дэпутацкім групам вылучыць у кожны зьменны цэх упаўнаважанага і ўстанавіць у кожным зьменным цэху кантрольныя пасты.

8. Разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў рабоце сэкцый і дэпутацкіх груп і сыстэматычна правяраць выкананьне прынятых абавязкаў.

9. Паставіць дакладны вучот работы сэкцый і дэпутацкіх груп кожнага члена і актывіста гарсавету.

10. Дабіцца поўнага ахопу рабочых прадпрыемстваў і ўстаноў пазыкай «3 рашаючы год пяцігодкі».

11. Усе члены сэкцый і савецкі актыў абавязваюцца быць укладчыкамі ашчадкасы і да 1 сьнежня завербаваць ня менш 5 асоб укладчыкаў ашчадкасы на кожнага члена гарсавету і актывіста.

12. Дэпутацкім групам завербаваць у савецкі актыў ня менш як 15 дэлегатак.

13. Ход работы і выкананьня ўзятых на сябе абавязкаў кожнай сэкцыяй і дэпутацкай групы асьвятляць у цэнтральным і мясцовым друку і насьценгазэтах.

14. На працягу аднаго месяца да 1 студзеня па ініцыятыве дэпутатаў ахапіць усіх рабочых прадпрыемстваў ударніцтвам, ні аднаго рабочага і дэпутата савету па-за ўдарнай брыгадай.

16. Праверку выкананьня сацумовы назначыць у Мазырскім гарсавеце ў канцы сьнежня 1931 г. і лютага 1932 г. з удзелам Рэчыцкага гарсавету і ўзаемным аглядам выкананьня сацумовы.

Мазырскі Гарадзкі Савет.

Вэндарскі сельсавет рашуча выкараўляе ванне дапушчаныя памылкі

Вэндарскі сельсавет, Магілеўскага раёну, уступіў у справаздачную кампанію з вялікімі посьпехамі на фронце калектывізацыі і збожжазагатовак. Пасьпяхова скончыўшы папярэдні агляд сваёй работы, (праўда са спазьненьнем) сельсавет зараз прыступіў да справаздачы перад шырокімі калгаснымі і бядняцка-сераднякімі масамі. Практыка папярэдняй і сучаснай работы Вэндарычны гаворыць, што справаздачная кампанія, якая шчыльна ўвязана з масавым аглядам работы савету, узьняла новую хвалю актыўнасьці мас. на выкананьне плянаў усіх відаў загатовак, зяблівага ворыва і мабілізацыі сродкаў. На 5 лістапада плян збожжазагатовак выканан па калгасным сэктары на 116,8 проц. і агульны на 94 проц. 6 лістапада ў падарунак 14 кастрычніку быў арганізаваны чырвоны завяршаючы абоз усіх відаў загатовак.

Але побач з гэтымі дасягненьнямі ў галіне хлебазагатовак быў дапушчаны рад грубых палітычных памылак, (аб чым мы ўжо паведамлялі). Масавая растлумачальная работа была падменена голым адміністраваньнем—дачай цьвёрдых заданьняў маламоцным серадняцкім і бядняцкім гаспадаркам. «Лявацкія» загібы былі шчыльна перамешаны з права-апартуністычнай практыкай, прымірэнцтвам да кулацтва. Рад сапраўдных кулацка-заможных гаспадарак ня былі абкладзены цьвёрдымі заданьнямі. Былы склад сельсавету абноўлены, ачышчаны ад правых апартуністаў і «левых» загібшыкаў. Памылкі дапушчаныя ў былой рабоце сельсавету рашуча выпраўлены. Стаўшы на шлях правільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі на грунце шырокай масавай работы, сельсавет стаў сапраўды баяздольным змагаром за выкананьне бягучых гаспадарча-палітычных кампаній.

Разьмеркаваньне прыбыткаў, як асноўнае рашаючае зьвяно ў гаспадарча-арганізацыйным умацаваньні калгасаў, праводзіцца па прынцыпу «хто больш і лепш працуе, той і больш атрымлівае».

Калгасы сельсавету сваячасова прапрацавалі пастанову НКЗ і Калгасцэнтру сярод калгасных мас, зрабілі дасканалы падлік працадзён кожнага калгасьніка і на аснове гэтага выдалі авансы. Дзякуючы гэтаму калгасы дабіліся значнага ўздыму працдысцыпліны і актыўнасьці, накіраванай на пасьпяховае сканчэньне ўборкі і асеньняй пасеўнай. Калгасы «Сталінскі заклік «Комунар Магілеўшчыны» і «Ударнік» перавыканалі пляны зяблівага ворыва, пасеўнай і датэрмінова скончылі ўборку.

Побач з гэтым некаторыя праўленьні калгасаў не ўзначаліл барацьбы за правільнае разьмеркаваньне прыбыткаў, за арганізацыйна-гаспадарчае ўзмацненьне калгасаў, а наадварот, правялі кулацкую ўраўнілаўку і імкнуцца гэтым разваліць калгас. Старшыня праўленьня калгасу «Савецкая Беларусь» сьвядома разьмяркоўваў капусту па дварох, упарта абараняў прынцып разьмеркаваньня ўраджаю пароўну і гэтым самым прыдышыў актыўнасьць калгасных мас на ўдарнае правядзеньне ўсіх калгасных работ. У калгасе «Варашылава» згублены працадні за два месяцы. У кніжку калгасьнікаў працадні запісваюцца як каму папала.

Галоўны недахоп сельсавету ў гэтым напрамку той, што да штодзённай работы ня былі прыцягнуты сэкцыі, якія літаральна нічога не рабілі. Старшыня сельсавету, седзячы за работай па цэлых начох, імкнуўся зрабіць усё сам.

Усе гэтыя недахопы, якія выявіліся ў ходзе справаздачнай кампаніі Вэндарскага сельсавету, могуць, павінны быць і будуць ліквідаваны на хаду.

Д. Алан.

Засталося 40 дзён да канца 3-га рашаючага

ГЭТЫЯ 40 ДЗЁН ПАВІННЫ БЫЦЬ ДНЯМІ БАЛЬШАВІЦКАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ 1931 г.

За 10 месяцаў 1931 г. прамфінплян выканан толькі на 84,3 проц.

1932 год сустрэць поўным выкананьнем праграмы трэцяга рашаючага

За 10 месяцаў 1931 г. плян па рэспубліканскай прамысловасьці выканан толькі на 84,3 проц.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі рабочая клясa БССР ідзе да новых перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, на фронце выкананьня прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

1931 г. дае значны рост выпуску прадукцыі. Паводле даных за 10 месяцаў 3-га рашаючага мы ў параўнаньні з тым-жа адрэзкам часу маем павялічэньне ў выпуску валавой прадукцыі на 140 проц., а па адносінах да кастрычніка 1930 г.—137 проц.

Наогул 1931 год паводле папярэдніх даных дае валавую прадукцыю ў 396,7 мл. рублёў супроць 259,6 мл. руб. у 1930 г. гэта азначае рост на 52 проц.

Гэта гаворыць аб тым, што лёзунг партыі 5-годка ў 4 гады—выконваецца дзякуючы гэраічнаму энтузіязму рабочай клясы, дзякуючы вышэйшым формам сацыялістычнай арганізацыі працы, дзякуючы правядзеньню ў жыцьцё шасьць ўмоў тав. Сталіна.

Таму некаторыя галіны прамысловасьці ўжо выканалі пяцігадовы плян і з посьпехам працягваюць барацьбу за бальшавіцкія тэмпы, за перавыкананьне плянаў пяцігодкі.

За 10 месяцаў 1931 году прамфінплян выконваюць і перавыконваюць скураная прамысловасьць (102,3 проц.), тэкстыльная (107 проц.), суконная (103,2 проц.), паліграфічная (103,3 проц.), шкляная (104 пр.), вашчавая (99,5 проц.).

Аднак побач з дасягненьнямі нельга не адзначыць недавыкананьне пляновых заданьняў на рэспубліканскай прамысловасьці БССР. За 10 месяцаў 1931 году агульны плян выкананы толькі на 84,3 проц. і гадавы плян выкананы на 67,7 проц.

Па асобных галінах прамысловасьці мы маем такі малюнак. За 10 месяцаў 1931 году плян выканалі:

Тарфяная прамысловасьць на 53,7 проц., мэталапрапоўчая на 69,2 пр., керамічная—47,2 проц., шкляная—68,8 проц., дрэваапрапоўчая—74,7 проц., хімічная—49,6 проц., папяровая—67,4 проц. Усяго па групе «А» 10-ці месячны плян выкананы на 73,2 проц.

Па групе «Б» агульны 10-ці месячны плян выкананы на 90,9 проц. Па асобных галінах гэтай групы мы маем такі малюнак:

Тэкстыльная прамысловасьць выканала плян на 83,3 проц., ільнапрадзільная на 90,4 проц., бавоўняная—81,8 проц., суконная—103,2 проц., панчошная—96,3 проц., швейная—95,9 проц., абутковая—79,2 проц., галянтарэйная—85,3 проц., паліграфічная—103,2 проц., друкарні 102,8 проц., запалкавая—76,9 проц.

Што-ж да якасных паказьнікаў, дык тут становішча яшчэ горшае. Зьні зілі сабекошт за 8 месяцаў толькі 4 галіны прамысловасьці. Фасфарытная замест плянавых 9,5 проц. зьнізіла да 10 проц., суконная замест 13,5 пр. па пляну дала 23,4 проц. Паліграфічная зьнізіла сабекошт на 9,9 проц. супроць плянавых—9,6 проц. і абутковая, якая дала 16,1 проц. зьніжэньня супроць плянавых—9 проц.

Па астатніх галінах прамысловасьці становішча дрэннае. Ёсьць такія прадпрыемствы, якія ня толькі не даюць зьніжэньня, а наадварот, павялічэньне. Да такіх прадпрыемстваў адносяцца: шкляная прамысловасьць, якая дала павялічэньне на 14,9 пр. Замест таго каб зьменшыць сабекошт на 8 проц., запалкавая+4,8 проц., фанэрная+22,7 проц., тэкстыльная +5,1 проц., ільнапрадзільная+34,2 проц., папяровая+9,3 проц.

Асноўнымі прычынамі недавыкананьня прамфінпляну зьяўляецца тое, што некаторыя аб'яднаньні, асобныя фабрыкі і ў першую чаргу грамадзкасьць гэтых фабрык не правялі ў жыцьцё пастанову ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б, дзе пленум падводзячы вынікі за першае паўгодзьдзе даў ясныя і вычарпальныя дырэктывы накіраваныя на ліквідацыю прарываў у прамфінпляне.

Там, дзе мы маем гэтыя прарывы, не ліквідавана поўнасьцю абязьлічка, там, фармальна падышлі да пераходу на гаспадарчы разьлік, там ня ўжыты новыя формы работы, і нарэшце, там не праведзены ў жыцьцё 6 умоў т. Сталіна, там гэтыя 6 умоў ня сталі праграмай дзеяньня.

Набліжаецца чацьвёрты, апошні год пяцігодкі. БССР намячае яшчэ больш высокія тэмпы разьвіцьця прамысловасьці. Рост валавой прадукцыі на 59 проц., рост прадукцыйнасьці працы на 25 проц., зьніжэньне сабекошту на 8,1 проц., капітальных укладаньняў на 78 мл. рублёў.

Гэта па сутнасьці—баявая праграма сацыялістычнага будаўніцтва. Гэту праграму трэба выкананць, ліквідаваўшы адставаньне, якое мы маем за 10 месяцаў 1931 году. З новай сілай узяцца за 100 процантнае выкананьне пляну 1931 году.

Нядбайнасьць цягне за сабой страты

Яшчэ ўлетку гэтага году, калі завод станавіўся на рамонт, рабочыя прапанавалі дырэкцыі перакласьці дно ваннай печы, якое ўжо 5 год не зьмянялася. Дырэкцыя была супроць. Роўна два тыдні праводзілі сходы, але рабочыя стаялі на сваёй думцы, а дырэкцыя—на сваёй, гаворачы, што моладзь хоча лішні тыдзень пагуляць.

Гэтыя спрэчкі «вырашыў» інжынэр Белшклотрэсту тав. Стаклікі, які паручыўся, што дно ваннай печы яшчэ вытрымае ўсю зьмену, вядома пры добрым догляде.

І вось у сьвята XIV Кастрычніка завод не працаваў. Электрастанцыя была на рамонце, ветрагоны былі закрыты. Шкляная маса распалілася, дно лопнула і маса палілася, ледзь здратавалі ўвесь завод ад пажару.

Зараз завод зноў стаў прыблізна на месяц: будуць і дно перакладаць і сьцены. Страты, згодна агляду спэцыяльнай камісіі, 50.000 руб. ну, а па-другое, могуць праваліцца пляны экспорту.

Зараз ужо і вінаватых няма. Акт, які быў складзены ўлетку, ляжаў у справах. Новы інжынэр ня ведаў аб становішчы дна ваннай печы, дырэкцыя забылася пра яго. Трэба знайсьці вінаватых і прыцягнуць іх да адказнасьці.

Брыгада.

Прыклад бюракратычнай а[illegible]скі

У жніўні 1930 г. гута «Акцябр», Асі павіцкага раёну, да былога тэхнарука гуты Міколы Гірша праз Быхаўскі нарсуд, прад'явіла прамадзянскі іск аб няправільным атрыманьні Гіршам больш 300 руб. Іск быў прад'яўлены да Гірша па месцу яго работы на гуце «Ільліч», Быхаўскага раёну.

Справа ў сьнежні месяцы мінулага году судом прызначана да слуханьня, куды быў камандыраваны прадстаўнік гуты, але справа не разглядалася з-за неяўкі адказчыка Гірша.

Прадстаўніком гуты быў заяўлены дадатковы іск аб выдатках па камандыроўцы.

З кастрычніка т. г. завод атрымаў паведамленьне, што «справа па іску гуты да Гірша накіравана ў Магілеўскую камеру яўрэйскага нацыянальнага суда, куды належыць і зварочэнта».

Чаму справа накіравана ў яўрэйскі нарсуд зусім незразумела? Гірш не яўрэй, а немец. Быхаўскаму нарсуду трэба было гэту справу накіраваць нарсуду... Нямецкай рэспублікі на Волзе (!)

Гірш толькі сьмяецца, незакінка скарыстаўшы больш 300 руб. і працуе спакойна на гуце «Ільліч», а суд рады, што справу сплавіў.

А. Вераб'ёў.

Скарыстаць кожную хвіліну

ДА НАСТУПЛЕНЬНЯ МАРОЗАЎ НА ПАДНЯЦЬЦЕ ЗЯБЛІВА

Очкаўціраціляў--да суровай адказнасьці

Пастанова партканлегіі ЦКК КП(б)Б

ПА ПЫТАНЬНІ ОЧКАЎЦІРАЦЕЛЬСТВА Ў СПРАВЕ ДАЧЫ ЗЬВЕСТАК АБ ДАТЭРМІНОВЫМ ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНУ АЗІМАГА ЗАСЕВУ ГАРАДОЦКІМІ РАЁННЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ.

1. Заслухаўшы паведамленьне прадстаўніка ЦК і ЦКК КП(б)Б, якія расьсьледавалі гэтую справу, парткалегія ЦКК КП(б)Б лічыць установленым, што з боку кіруючых працаўнікоў Гарадоцкага раёну—сакратара райкому КП(б)Б т. Арашчука, і старшыні РВК т. Сапрыцкага было пасля на цэнтральным установам паведамленьне аб датэрміновым выкананьні і перавыкананьні пляну асеньняй сяўбы ў той час, як сапраўдны плян сяўбы быў выкананы толькі на 70-75 пр., што прыяло да апускання партыі і очкаўціраецьтва цэнтральным кіраўніцтвам.

2. Гэта здарылася, па-першае, таму, што ў раёне панаваў апартуністычны самацёк у гэтым пытаньні, нікрытычныя адносіны да зьвестак, якія прадстаўлялі нізавымі органамі (сельсаветамі) і прымірэнчыя адносіны да яўнага очкаўціраецьтва з боку гэтых органаў раённых устаноў, фактычна заахвочвалі гэтыя нізавы органы давать завядома ілжывыя і неабгрунтаваныя нічым даныя; па другое, наяўнасьць гідобных права-апартуністычных разлажаньняў і правай практыкі з боку паасобных кіруючых працаўнікоў раёну (старшыні РВК т. Сапрыцкага аб «закономернасьці» недасеву і перэтаганьне яго на рвацкія спажывецкія тэндэнцыі паасобных калгасьнікаў; Маргодіна—загадчыка Арг аддзелу РК і «паўстыхійнасьці» пры правядзеньні пляну азімай сяўбы і інш.).

3. Канстатаваць, што бюро раённага камітэту КП(б)Б, сумаюўшыся на дасягненьнях, маючыхся ў калектыўізацыі, пасьпяховым выкананьні весьнавой сяўбы, уборачнай кампаніі, недаацаніла важнасьці выкананьня пляну сяўбы азімых і замест мабілізацыі чвагі партарганізацыі, калгасьнікаў, бядняка-сераднякіх мас на пасьпяховае правядзеньне сяўбы—дапусьціла сама цёк, паслабіла эпрацыйнае кіраўніцтва сяўбой, у тымку чаго здарыўся прарыў сяўбы азімінь.

Будучы пастаўлена перад фактам гэтага прарыву, бюро райкому хапіла і прыняло меры да ліквідацыі яго, але нерэшуча ўдарыла па права-апартуністычным памылкам пасобных працаўнікоў і несвоячасова прыняло меры да ліквідацыі самацёку ў выкананьні пляну сяўбы азімінь, у выніку чаго наогул застаўся плян сяўбы ня скончаным.

Выходзячы з гэтага Парткалегія ЦКК КП(б)Б пастанаўляе:

1. За пасьлеку цэнтральным органам няправільных зьвестак аб скончэньні сяўбы азімінь, што зьявілася простым очкаўціраецьтвам, што паслабіла увагу і дэмабілізавала партарганізацыю аб барацьбе за своячасовае скончэньне сяўбы азімінь,—сакратару раённага камітэту КП(б)Б т. Арашчуку аб зняцьці вымову.

2. За яўна нездавальняючае апэрацыйнае кіраўніцтва работай сельсаветаў па выкананьні пляну сяўбы, за некрытычныя адносіны да прадстаўленых сельсаветамі справаздачных, за очкаўціраецьтва пры дасылцы зьвестак у цэнтральныя ўстановы, за нядбаю апору кулацкай вылазцы на зьлёце калгасьнікаў, і праваапартуністычныя адносіны да выкананьня асеньняй сяўбы (законамернасьць недасеву на 10 проц.)—старшыні РВК т. Сапрыцкаму абвясьціць сурозую вымову.

3. Пацьвердзіць пастанову Гарадоцкай РКК аб дачы суровай вымовы за гадчыку райза т. Сімакову і зьняць яго з работы загадчыка райза Гарадоцкага РВК.

4. Прыняць да ведама заяву т. Арашчука і Дзейка, што ў адносінах загадчыка Артаддзелу райкому т. Мар голіна справа яго будзе разгледжана мясцовымі органамі.

5. Адобрыць дзеяньні Гарадоцкай РКК па гэтай справе, якая сыгналізавала цэнтральным установам аб очкаўціраецьтве гарадоцкіх арганізацый.

6. Папярэдзіць усе раённыя арганізацыі, што прадстаўленьне ў цэнтральныя органы няправільных зьвестак аб ходзе выкананьня тэй ці іншай гаспадарча-палітычнай кампаніі,—будзе разглядацца як самае цяжкае парушэньне злачынства і пры выяўленьні злосных фактаў вінаватых будуць прыцягнуты да самай суровай партыйнай адказнасьці, аж да выключэньня з партыі.

7. Улічваючы важнае значэньне, якое мае апэрацыйная статыстыка ў справе правільнага і своячасовага вучоту ходу важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній,—прапанаваць РК і РВК на пастаноўку гэтага пытаньня зьвярнуць асаблівую увагу.

Адначасова даручыць групе савецкага апарату НК РСІ распрацаваць рад канкрэтных мерапрыемстваў па ўпарадкаваньні і палепшаньні справы статыстыкі па гэтых пытаньнях у сельсаветах і РВК.

8. Пастанову апублікаваць у друку.

Трактары стаяць без работы, а коні разбазарваюцца

СЯННО. На 10 лістапада плян зяблівага ворыва па Сенеискім раёне быў выканан толькі на 32 проц.

Такі ганебны прарыў тлумачыцца апартуністычнай недаацэнкай надыходзячай вёснавой сяўбы з боку паасобных партячэек і сельсаветаў.

Ня чым іншым, як злосным ігнараваньнем дырэктыў партыі, нельга вытлумачыць факты, што па Сідарніцкім сельсавеце плян зябу выкананы на 6 проц., па Аленсініцкім—17 проц., па Расьнянскім 23 проц. і г. д.

Раённыя ўстановы і арганізацыі ў гэтым пытаньні праяўляюць бязьдзейнасьць. Райза замест мабілізацыі мас і апэрацыйнага кіраўніцтва ходам ворыва абмяжоўваюцца толькі зборам зьвестак па тэлефону. МТС і райкалгасаюз таксама бязьдзейнічаюць.

Дырэктыва партыі аб 100 проц. перавозе трактароў злачынна ігнаруецца, ня ўсе трактары пераведзены на кругласутачную работу. Праўленьні калгасаў замест перакідкі ўсёй цягавай сілы на зяблівa, разбазарваюць коняй.

Наогул па раёне надзвычайна пашырана «выбракоўка» коняй. Так напрыклад калгас «Папоўка», Нямойцянскага сельсавету, з 30 коняй выбракаваў 10, калгас «Апечкі», Латыгальскага сельсавету, з 25 коняй выбракаваў 6 коняй і г. д. А якія гэта «выбракованыя» коні?—Гэта звычайныя сялянскія коні ва ўзросьце ад 7—15 год, упаўне прыгодныя для сельскай гаспадаркі.

Надалей такое становішча нецярпіма. Патрэбна рашуча ўдарыць па кулацкай агітацыі за выбракоўку коняй, неабходна выканаць дырэктывы партыі аб пераводзе ўсёй цягавай конскай сілы і трактарнага парку на зяблівa.

У бліжэйшыя дні плян зяблівага ворыва павінен быць выкананы.

В. Зяневіч.

Пераключыць усю цягаву [illegible] на зяблівa

ВОРША. (Белта). Зяблівае ворыва ў раёне ўсё яшчэ застацца адсталым вучасткам. На 10 лістапада плян па зябу выкананы на 71 проц.

Чатыры трактары, якія працавалі на зяблівe ў калгасах Веравайшанскага сельсавету, выйшлі са строю з-за адсутнасьці мазуты. Конская сіла не пераключана калгасамі на ворыва. Калгас «Новае жыньцё», Шапкаўскага сельсавету, замест 60 га зазяблі толькі 10 га.

Надвор'е вельмі спрыяе. Зяблі ць да маразоў—павінна стаць лёзунгам і практычнай праграмай усіх калгасаў.

НЯ УКЛЮЧЫЛІСЯ У ФІНЭСТАФЭТУ

раённыя камітэты фінбанкаўскіх работнікаў Рэчыцы, Мазыру, Нароўлі і Рагачэву

Рапарт-пераклічку фінбанкаўскіх работнікаў аб сваёй рабоце на фінансавым фронце ператварыць у самаправерку разгортваньня фінэстафэты

Рапарт-пераклічка павінна выявіць

лепшыя і адстаючыя РМК ФБР у галіне мабілізацыі сродкаў

З 20 лістапада да 15 сьнежня рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь», ЦП саюзу фінбанкаўскіх работнікаў і НКФ БССР праводзяць рапарт-пераклічку РМК ФБР аб іх дзейнасьці ў правядзеньні фінэстафэты і выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў з насельніцтва ў 4 квартале 3-га рашаючага году пяцігодкі. Асноўныя задачы пераклічкі—выявіць, як РМК ФБР здолеў па базовому правесьці работу, змагаючыся за першыя месцы ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў з насельніцтва 4 кварталу, якая грамадзкая работа імі праведзена па аказаньні дапамогі прадпрыемствам, калгасам, саўгасам, вёскам і установам па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў, Рапарт-пераклічка павінна таксама садзейнічаць сапраўднаму разгортваньню і перапаўненьні справаздачна-выбарчай кампаніі РМК у шырокую гаспадарча-палітычную кампанію.

Агляд работы РМК па 9 раёнах банкаўскіх работнікаў) даў дрэнны мізацыі сродкаў насельніцтва і ў правядзеньні фінэстафэты. Рад РМК яшчэ да гэтага часу нават ня ўключыліся ў фінэстафэту (Рэчыцкі, Мазырскі, Нараўлянскі і Рагачэўскі). У Жлобіне, Воршы, Горках РМК імкнуліся разгарнуць некаторую работу па фінэстафэце, але за іншымі кампаніямі» не хапіла часу на фінэстафэту і нічога практычнага ў правядзеньні фінэстафэты РМК гэтых раёнаў не зрабілі.

Пры агляде РМК выявілася, што толькі ў Быхаве і Ельску РМК фінбанкаўскіх работнікаў уключыліся ў фінэстафэту і дабіліся значных посьпехаў у мабілізацыі сродкаў. Яны зараз-жа калі ўключыліся ў фінэстафэту мабілізавалі раённы актыў у сельсаветы па правядзеньні фінэстафэты. У сельсаветах арганізавалі штабы, якія і кіравалі правядзеньнем фінэстафэты. У адказ на адозву НКФ і ЦП саюзу Асьветы арганізавалі сацспаборніцтва паміж школамі па ўдзелу ў фінэстафэце.

У Жлобіне, Воршы, Горках штабы ў сельсаветах, па прадпрыемствах і гарадох ня былі арганізаваны. Арганізаваныя райштабы замест жывога апэрацыйнага кіраўніцтва абмяжоўваліся звычайнымі паседжаньнямі.

Па Быхаўшчыне фінэстафэта сапраўды стварыла вялізарнейшы ўздым грамадзкасьці ў выкананьні фінпляну. Па руліцах Быхава вывешаны лёзунгі аб фінэстафэце. За час эстафэты фінбанкаўцы выявілі 4-х лепшых ударнікаў, якія на працягу 2-3 дзён зьбіралі сродкі па 10-17 тысяч рублёў.

Па абгледжаных раёнах у большасьці выпадкаў з боку РМК назіраюцца шкодныя адносіны да выкананьня дырэктыў ЦП. За гэта быў распушчан РМК Рагачэўшчыны. Надалей неабходна больш рашуча ўдарыць па бязьдзейнічаючых РМК ня толькі роспускам і выключэньнем з саюзу, а ў паасобных выпадках арганізоўваць таварыска - паказальныя вытворчыя суды, выстаўшы ў гэтыя раёны лепшых ударнікаў перадазных раёнаў. Перад кожным членам саюзу ФБР, перад кожным РМК і ЦП саюзу стаць задача дабіцца датэрміновага выкананьня фінпляну 4-га ўдарнага кварталу. Па базовому завяршэньню кампаніі па перавыборах нізавых органаў пераключаючыся на сапраўднае разгортваньне фінансавай эстафэты, выкананьне сац. дагавору в Заходняй вобласьцю, вабясьпечыўшы посьпехі датэрміновага выкананьня фінпляну 4-га ўдарнага кварталу.

Пархоменка.

Дамагчыся пералому

Ход мабілізацыі сродкаў па Бялевіцкім сельсавеце, Магілеўскага раёну, застацца вуна нездавальняючым. 9 дзён лістапада хоць і даюць падвышэньне супроць папярэдніх паступленьняў, але-ж далёка невыстарчальнае.

Зусім нездавальняючым зьяўляецца выкананьне пляну па ўкладах ў ашчадкасу (18 проц.), рэалізацыі акцый Трактарацэнтру і набыцьці машынных абавязацельстваў. Апульны плян па гэтых 2 галінах—4.000 руб. выкананы на 4,5 проц.

Слабейшым вучасткам фінансавага фронту зьяўляецца рэалізацыя і афармленьне пазыкі «3 рашаючага году». Кантрольная лічба ў 12.000 руб выканана на 5.556 руб., альбо 44 проц.

Партячэйка і [illegible] савет, апартуністычная недаацэнкай мабілізацыі сродкаў і бязьдзейнасьцю ў гэтай галіне цягнуць уніз крывую выкананьня фінпляну. Мабілізацыя сродкаў Бялевіцкім сельсаветам не мі правадзімыі на вёсцы гаспадарча-палітычнымі кампаніямі.

Правадзімае зараз усебеларускае сацспаборніцтва саветаў за права быць занесеным у «Чырвоную кнігу сацыялістычных рапартоў саветаў» і Усебеларуская фінэстафэта зьяўляюцца матутнымі багарамі хутчэйшага выкананьня фінпляну. [illegible] вет павінен ук[illegible] ніцтва за месца [illegible] дабіцца круто[illegible] нанні фін[illegible]

Сельсаветы Сеньненскага раёну павінны зараз-жа ўключыцца ў фінэстафэту

СЯННО. Рад сельсаветаў ня ўключыўся ў фінэстафэту, з прыч

Біць рублём за затрымку грузаў

Аршанскі чыгуначны вузел не мехалізуе пагрузкі і выгрузкі, не вядзе вучоту сацспаборніцтва і ўдарніцтва

„Устанавіць сыстэму найстрогай матар'яльнай адказнасьці за пагрузку і выгрузку вагонаў..." (З дакладу тав. Андрэева)

Аршанскі чыгуначны вузел

не ведае сваіх ударнікаў і лжэ-ударнікаў

ВОРША. (Белта).

Зводкі аб стане сацспаборніцтва і ўдарніцтва па Аршанскім вузьле гавораць аб добрым становішчы. На 1 кастрычніка, па вестках прафарганізацыі вузла, сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплена па дэпо 89,6 проц. рабочых, па станцыі—83,9 проц. і на шляху—100 проц., на сувязі—87,4 проц. Пры праверцы брыгадай стану ўдарніцтва і разгортвання сацспаборніцтва аказалася, што мэтады арганізацыі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, якія праводзяцца, па сутнасьці справы апашяюць значэньне гэтых важнейшых сацыялістычных форм працы. На вузьле справа пастаўлена так, што даволі аб'явіць сябе ўдарнікам, каб атрымаць кніжку ўдарніка. Праверкі ўдарніцтва не вядзецца. Вось адкуль бярэцца «сто процантаў» ўдарнікаў.

Машыніст Бакуненка проста заявіў, што «частка рабочых заключылі ўмову для таго, каб атрымаць кніжку ўдарніка». Ясьць такая практыка, што ашуканцы плянуюць умовы, па якім аб'явіўшы сябе ўдарнікамі бяруць на сябе адпаведныя абавязацельствы і выклікаюць усіх іншых «наогул». Пасьля гэта ўмова здаецца ў цэхавы каміцэт, адкуль зараз-жа выдаюцца кніжкі ўдарніка. Інструктар партарганізатар т. Лаўрэсевіч заявіў, што гэта мэта маскоўскіх чыгуначнікаў—заключыць умову на сацспаборніцтва, атрымліваць кніжку ўдарніка». Мы лічым, што т. Лаўрусевіч узводзіць напаклёп на маскоўскіх чыгуначнікаў. Трэба каб тыя, хто спаборнічае, ведалі, як выконваюцца ўмовы і ўвятыя абавязацельствы, трэба каб грамадзкія арганізацыі сыстэматычна правяралі выкананьне ўмовы.

Вось, што гаворыць машыніст т. Чуярын: «Мы ўмову падпісалі ўжо калі году таму назад і выклікалі на спаборніцтва ўсе паравозныя брыгады дэпо, але гэтая ўмова і да гэтага часу ляжыць у цэхкоме, а якія вынікі ад спаборніцтва, ніхто ня ведае, ніхто нічога не правяраў».

Таком чынам, розьніцы паміж супраўдным ударнікам, гультаём і прагульшчыкам няма.

Недарма можна пачуць такія гутаркі сярод рабочых: «Навошта мне стараніца, калі ўсё, што атрымлівае ўдарнік, даюць і прагульшчыку і п'яніцу, і рвачу». Чорныя і чырвоныя дошкі ня вывешваюцца. Можна знайсьці ад ну дошку ў цэхкоме з надпісам «зводка сацспаборнічаючых», на якой нікоі і ніхто не адзначаў прыкладаў добрай і дрэнпай работы.

Партыйнае кіраўніцтва Аршанскага вузла дапусьціла грубейшую палітычную памылку, не правяраючы стану сацспаборніцтва на вузьле, сьлепа пайшла дыходзячы да вестак вучотнікаў сацспаборніцтва, якія стараліся атрымаць большы процант удзельнікаў спаборніцтва. Гэтым самым было змазана палітычнае значэньне і роля ўдарніцтва на вытзорчасьці і ў грамадзкай рабоце.

Мэханізаваць пагрузку і выгрузку

У выніку няпрыняцьця мер па наладжаньні пагрузачна - выгрузачных работ, заданьне III кварталу па пагрузцы і выгрузцы грузаў на аршанскім чыгуначным вузьле выканана ня больш як на 55 проц. Прычыны—не ўкамплектаванасьць штатаў грузчыкаў, адсутнасьць правільнае арганізацыі працы і значны недахоп калёсных тачак. Уся работа праводзіцца па старыцы. Ніякай мэханізацыі пагрузкі і выгрузкі яшчэ не намячаецца.

Па пляну было намечана ўстанавіць транспарцер, нават ужо былі атрыманы пасы, але па нейкіх прычынах пралежаўшыя на складзе матар'ялы былі накіраваны назад. Пабудаваны ў гэтым годзе сартовачныя рампа і пакгауз таксама не прыстасаваны да мэханізацыі, яны зданы ў экспляатацыю без якой-бы то ні было тэхнічнай прыёмкі. Тэхнічным умовам пакгауз і рампа не адпавядаюць. У выніку нядбайных адносін да будаўніцтва падлогі ў памяшканьнях ужо праваліліся, страха працякае. Вадастокі ня зроблены. Грузы мокнуць і псуюцца, але самае галоўнае гэта тое, што рампа і пакгауз не адпавядаюць узросшым патокам грузу.

Вынікі нераспарадчасьці адміністрацыі застаўляюць рабіць шмат лішняй работы і гэта ў сваю чаргу выклікае затрымку грузаў. Выгрузка вельмі часта праводзіцца недапушчальна дрэнна. Бывае калі ў адзін ярус звальваецца ўсё — дровы, вугаль і дрот. У грязі пад дажджом больш трох месяцаў ляжаць прычэпныя часткі да трактароў. Гэта сьведчыць аб недбайных адносін клієнтуры да хаваньня грузаў. Трэба пракласьці пляцоўкі між сартовачнай рампай і пакгаузам, што дасьць магчымасьць палепшыць умовы працы рабочых грузчыкаў, павялічыць іх прадукцыйнасьць працы, а гэтым самым паскорыць разгрузку і выгрузку вагонаў.

Частыя выпадкі калі грузы з Воршы засылаюцца не на назначныя, чым выклікаецца лішні прабег вагонаў.

Складзеныя графікі руху цягнікоў ня выконваюцца. За кастрычнік 20 цягнікаў вышлі з графіку - руху толькі ў выніку не вагляданьня за раскладам прыбыцьця і адпраўкі цягнікоў—прычына несвая часовая падача паравозаў, несвая часовая зборка саставаў і г. д.

Б.

Чыгуначнікі за тэхвучобай.

Забясьпечыць поўнае правядзеньне спаранай

Праведзенае падагуленьне становішча спаранай ядзы па Жлобінскім раёне, за першую дэкаду лістапада ацаказвае, што спараная дасягнула:

(Дэпо)	(на паравозах)	(па брыгадах)
Жлобін. . .	98.83	99,49
Мілей. . .	98.92	97,62
Аліовічы . .	92,95	94,6
Парён . .	95,03	97,3

Першым ідзе Жлобінскае дэпо. За 12 дзён лістапада на дэпо ня было ніводнага зрыву спаранай. Прапрацаваўшы загад тав. Андрэева і пастановы Кастрычніцкага пленуму, рабочыя і адміністрацыйна - тэхнічны пэрсанал Жлобінскага дэпо сапраўды пабальшавіцку прыступілі да ажыцьцяўленьня лёзунгу: 100 проц. спаранай.

Сур'ёзныя адносіны з боку адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу і да равозьнікаў да справы поўнага замацаваньня спаранай паказалі ўсёй цягавай гаспадарцы нашага раёну, што можна дабіцца 100 проц. спаранай. З 7-га па 12-га лістапада ўключна спараная па Жлобіну дала 100 проц.

Горш з замацаваньнем спаранай па Магілеве. Лічбы і факты паказваюць, што адміністрацыя і прафарганізацыі Магілеўскага дэпо не вядуць жорсткай барацьбы за замацаваньне спаранай і вакол гэтага пытаньня слаба ма білізавана ўвага рабочых - паравозьнікаў.

Галоўная прычына зрываў спаранай — хвароба паравозьнікаў, тлумачыць адміністрацыя Магілеўскага дэпо.

Партыйнай і прафсаюзнай арганізацыям патрэбна будзе зараз-жа зьвярнуць асаблівую ўвагу на гэтыя «прычыны» зрываў.

Яшчэ горш становішча спаранай па Асіпавіцкім дэпо. За пасобныя дні зрывы спаранай даходзяць да 25 пр. (2-га лістапада). Гэта паказвае на апартуністычныя адносіны да справы замацаваньня спаранай. Ёсьць таксама «прычыны» — не хапае паравозьнікаў на ўсе паравозы. Але замест таго, каб павялічыць кадры, узмацніць іх кваліфікацыю, адміністрацыя Асіпавіцкага дэпо нядбайна да іх адносіцца.

Пры ўдзеле партыйных і прафсаюзных арганізацый па «розных прычынах» у кастрычніку былі зволены і зьняты з паравозаў 12 паравозьнікаў.

Раўняючыся па Жлобінцах, як лепшых барацьбітох за спараную, партыйным, прафсаюзным і гаспадарчым арганізацыям аддзелу цягі нашага раёну патрэбна зараз-жа павесьці сталую работу, мабілізаваць усе сілы і магчымасьці на 100 проц. замацаваньня спаранай.

Рашуча ўдарыць па зрыўшчыках і апартуністах, якія ня выконваюць і ня хочуць выконваць дырэктывы партыі па барацьбе за здаровы паравоз. (Белта).

Замест дапамогі ў будаўніцтве..

Кіраўнікі райаддзелу сувязі на працягу ўсяго часу будаўніцтва радыёвузла бязьдзейнічалі ня гледзячы на тое, што тэхнічнаму пэрсаналу былі даданы сезячасовыя дырэктывы з Беларадыёцэнтра аб будаўніцтве.

Як на будаўніцтва радыёвузла гляджэў загадчык райаддзелу сувязі т. Бярлыга? Ёй патрэбна было скарыстаць месячны чарговы адпачынак, а таму яна пакінула ўсё на тэхнічнага адміністратара т. Тамкова, які ў сваю чаргу, гледзячы на загадчыка, таксама нічога не рабіў.

Калі прыехаў загадчык радыё-вузла т. Шашла Я., то тут разгарнуліся шпаркія тэмпы будаўніцтва, тут пашла сапраўды ўдарная праца. І дзякуючы яго бальшавіцкай настойлівасьці тран слацыйны вузел у Жлобіне быў пабудаваны да 14 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Засталося адно, рапартаваць аб перамогах... І за гэта ўжо ўзяліся прыехаўшыя з адпачынку.

Хаваючы сваю бязьдзейнасьць, яны рапартуюць райкому партыі, райвыканкому, райпрафсавету праз раённую газэту «Шлях сацыялізму» і г. д.

Мы запытаемся ў т. т. Бярлыга і Тамкова чаму яны нічога не рабілі, не дапамагалі ў будаўніцтве радыёвузла?

Гарошка Кастусь.

Праверка становішча

рацыяналізатарскай работы ва ўстановах

Праверка становішча рацыяналізатарскай работы па Менску праходзіць нездавальняюча

Разгортваньне масавай праверкі становішча рацыяналізатарскай работы ва ўстановах гораду Менску праходзіць яўна нездавальняюча. Абавязацельствы дадзеныя прадстаўнікамі ўстаноў на нарадзе 10 лістапада, што яны з 11 лістапада пачнуць работу па праверцы, на сёньня рад устаноў гэтага ня выканалі.

Толькі па некаторых установах як НКФ, НКЮ, дзяржбанк, НКЗем праверка пачата і належным чынам разгортваецца. У гэтых установах пытаньне праверкі абгаворана на пасяджэньні партыйных і прафсаюзных арганізацый. Складзены праверачныя брыгады, якія ўжо прыступілі да практычнай работы. Задачы праверкі асьветленыя ў насьцен. газэтах, арганізаваны збор прапаноў па спрашчэньні і паляпшэньні работы апарату і па рабоце ў галіне рацыяналізацыі на далейшы час.

Такіх устаноў, у якіх пачата праверка па становішчы рацыяналізатарскай работы па Менску, налічваецца зусім мала. У большасьці ўстаноў як Дзяржплян, Наркамснаб, Белдзяржгандаль, МЦРК і інш. праверка яшчэ не пачата. Гэта тлумачыцца тым, што партыйная і МК паказаных установ не ўдзялілі належнай увагі праверцы рацыяналізатарскай работы па сваіх установах.

Трэба адзначыць і тое, што сярод некаторых работнікаў прафарганізацыі (мясцком НКЮ, гарком каапэрацыі, Дзяржгандаль і інш) маецца думка, што праверка рацработы перашкодзіць перавыбарчай кампаніі прафарганізацыі. Па думцы гэтых работнікаў па-першае трэба скончыць перавыбарчую кампанію прафорганаў, а потым прыступіць да праверкі рацыяналізатарскай работы.

Такія разважаньні аб чарговасьці кампаній ёсьць нішто іншае як імкненьне апраўдаць пасыўныя адносіны раду устаноў да справы арганізацыі праверкі рацыяналізатарскай работы.

Партыйным і прафсаюзным арганізацыям ня трэба траціць ні адной хвіліны на розныя разважаньні, а з ўсёй рашучасьцю ўзяцца за арганізацыю праверкі станозішча рацыяналізатарскай работы.

З. Н.

ЦК саюзаў павінны ўключыцца ў праверку

У праверку становішча рацыяналізатарскай работы ў савецкіх установах, якая праводзіцца ЦКК НК РСІ сумесна з газэтай «Савецкая Беларусь» уключыліся ЦК саюзаў дзяржаўных і фінансава-банкаўскіх, устаноў, работнікаў з каапэрацыі і дзяржгандлю і работнікаў земляробчых саўгасаў.

ЦК саюзу работнікаў каапэрацыі і дзяржгандлю выклікалі на сацспаборніцтва па лепшай арганізацыі правядзеньня праверкі ЦК саюзу дзяржаўных і фінбанкаўскіх устаноў.

Разам з гэтым трэба адзначыць, што ня ўсе яшчэ ўключыўшыяся ў праверку прыступілі да практычнай работы. Трэба неадкладна ўключыўшымся ЦК саюзаў ў праверку становішча рацыяналізатарскай работы прыступіць да практычнай работы і забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне праверкі.

ЦК саюзаў, якія яшчэ няўключыліся ў праверку, павінны ў бліжэйшы час уключыцца ў яе.

З. Н.

Шырэй удзел ударнікаў у кіраўніцтве дзяржапаратам

Рабочыя - энтузіясты сацыялістычнага будаўніцтва — прымаючы ў якасьці шэфаў актыўны ўдзел у рабоце савецкага апарату, высунулі новую вышэйшую форму шэфства—сацыялістычнае сумяшчаньне, якое заключаецца ў тым, што «рабочыя застаючыся на вытворчасьці, бясплатна выконваюць пасобныя функцыі кіраўніцтва ў савапараце» (з пастановы прэз. ЦКК УсеКП(б).

Гэта новая творчая ініцыятыва рабочай клясы кладзе пачатак ажыцьцяўленьню ідэі Ул. І. Леніна, «мэтай нашай — гаварыў тав. Ленін зьяўляецца бясплатнае выкананьне дзяржаўных абавязкаў кожным працоўным пасьля сканчэньня васьмігадзіннага «заданьня» вытворчай работы».

Побач з сэкцыямі саветаў і дэпутацкімі групамі, новы вопыт сацыялістычнага сумяшчаньня набывае вялізарнае значэньне «ва ўзмацненьні сувязі рабочых з апаратам і іх кантролі, і ўплыву на апарат» (дакл. т. Андрэева на III-м пленуме ЦКК УсеКП(б).

Пяты пленум ЦКК КП(б)Б прыняў дырэктыву «павесьці бязьлітасную барацьбу з апартуністычнай недаацэнкай і ігнараваньнем рабочага шэфства і сацыялістычнай сумяшчальнасьці...»

Грамадзкі агляд фактычнага станоішча масавай работы саветаў, шэфства і сацсумяшчальнасьці ў жніўні выявіў «няяўнасьць у БССР раду пось пехаў у справе ўцягненьня рабочых мас у работу дзяржапарату і барацьбы з бюракратызмам, удзел каля 400 тысяч працоўных у чыстцы і праверцы савецкага апарату, стварэньне рабочага актыву вакол работы органаў Наркамонабу, НКФ, каапэрацыі, НКЮ, удзел рабочых брыгадзіраў ва ўсіх важнейшых палітычна - гаспадарчых кампаніях, унясеньне шэф брыгадамі раду рацыяналізатарскіх прапаноў, шырокі ўдзел працоўных у штодзённай рабоце органаў НК-РСІ».

Па БССР вылучана каля 500 рабочых сацыялістычных сумяшчальнікаў і каля 250 з іх праводзяць пэўную работу.

Сацыялістычныя сумяшчальнікі сваёй работай ва ўстановах прынесьлі значную карысьць сацыялістычнаму будаўніцтву, аб чым сьведчыць друкаваньне.

Так, 7 рабочых заводу «Пралетары» (Менск) сацсумяшчальнікі па НКЮ са мастойна працуюць, даюць заключэньні па судовых справах, прымаюць наведвальнікаў, арганізуюць кантроль за выкананьнем. Па іх ініцыятыве было перагледжана некалькі няправільна вырашаных нарсудамі спраў. Сацсумяшчальнікі гарбарні імя Лекерта (Віцебск) правялі масавы агляд падрыхтоўкі школ да навучальнага году. Рабочыя заводу імя Ланцуцкага (Гомель) дапамаглі гарфінаддзелу ліквідаваць прарыў у выкананьні фінпляну і інш.

Некаторымі пасобнымі рабочымі сацыялістычнымі сумяшчальнікамі праведзена вельмі карысная работа. У ВСНГ — тав. Фэльдман — сацсумяшчальнік інспэктара ВТНУ—увайшоў у курс справы і прымае ўдзел ва ўкамплектаваньні навучальных устаноў. Рабочы тав. Бузінаў сацсумяшчальнік дырэктара сельгасаб'яднаньня—правёў вялікую работу ў прыгарадных саўгасах па пераводзе іх на гаспадарчы разьлік і зьдзельшчыну; некалькі раз выяжджаў у саўгасы, зьбіраў там трыкутнік, праводзіў масавыя сходы. Ва ўстанове ён бывае штодня пасьля работы і ў выхадныя дні. Тав. Мінькоў, сацсумяшчальнік дырэктара Белпрамхлеба — прынёс значную карысьць сваёй работай: ён займаўся пытаньнямі мэханізацыі хлебазаводу, вы явіў недахоп некаторых частак машын, склікаў на хлебазаводзе вытворчыя нарады па якасьці, зьезьдзіў у Маскву і гэтым даў многа карысьці. Тав. Кузьняцоў — сацсумяшчальнік дырэктара Белплодагародніны, заняўся работай па пастановуцы дробнага гандлю, па адкрыцьці новых магазынаў, сачыць за якасьцю прадукцыі.

Пералік падобных узорных прыкладаў ужываньня творчай ініцыятывы рабочых можна было-б працягнуць, ня гледзячы на тое, што ў БССР практы ка сацыялістычнай сумяшчальнасьці яшчэ не атрымала ні дастаковага размаху, ні належнага падтрыманьня як з боку трыкутнікаў устаноў, так і з боку заводзкіх арганізацый.

Той факт, што рабочыя - ударнікі, энтузіясты сацыялістычнага будаўніцтва, нават, пры самай нязначнай увазе справе сацсумяшчальнасьці з боку грамадзкасьці і кіраўніцкай устаноў, самі правільна знаходзяць карысную работу і самі падыходзяць да непасрэднага ўдзелу ў рабоце апарату—гэты факт паказвае, што перад сацыялістычнай сумяшчальнасьцю — шырокі шлях па ўцягненьні рабочых мас у кіраўніцтва дзяржавай.

Трэба толькі выправіць тыя памылкі і скажэньні, якія дзе-ні-дзе былі дапушчаны ў гэтай справе і рашуча паставіць пытаньне перад мясцовымі кіруючымі органамі аб сапраўдным павароце тварам да гэтага важнейшага пытаньня.

А выпраўляць і «паварочваць» ёсьць што.

Вось прыклады:

Прэзыдыум Менскага гарсавету яшчэ ў маі вызначыў 30 пасад для сацыялістычнай сумяшчальнасьці, але на працягу некалькіх месяцаў аддзелы і інспэкцыі Гарсавету ня ведалі, што вылучаныя сацсумяшчальнікі, ня ведалі хто іх шэф і зусім ня цікавіліся гэтымі пытаньнямі.

У НКАсьвеце было вылучана 9 сацсаўмяшчальнікаў, але працаваў толькі адзін. Ніхто не зацікавіўся з якой прычыны астатнія не прыступалі да працы, быццам прытрымліваліся вядомай пагаворкі: «сядок з каня,—калёсам лягчэй».

Віцебскім гарграфсаветам вылучана 24 сацсумяшчальнікі і грамадзкія інспэктары, але ніводзін не працуе і ніхто аб гэтым не клапоціцца. Трэба было вылучыць сацсумяшчальнікаў з 14 прадпрыемстваў, а вылучылі толькі з 3-х. Першыя сустрэчы гэтых сумяшчальнікаў з установамі былі поўны самых абурачых момантаў. Так, сацсумяшчальнік заггарфінаддзелу тры разы прыходзіў да загадчыка, але той ня мог яго прыняць, разважаючы, відавочна, што на гэта ня трэба траціць свой час,—дробязь. Загадчык камгасу яшчэ «хітрэйшы»: ён свайго сацсумяшчальніка ўжо на другі дзень сустрэчы пакінуў аднаго вырашаць справы; на яго наваліліся сотні навед вальнікаў па кватэрных пытаньнях і ён больш ня прыходзіў да «ўважлівага» загадчыка.

У Бабруйску было вылучана 35 сацсумяшчальнікаў, а працавала толькі—пяць.

Па Воршы сацсумяшчальнікаў зусім ня вылучылі і ня думалі аб гэтым да самага моманту праверкі.

І ў сэнсе скарыстаньня сацсумяшчальнікаў побач з прыведзенымі вышэй добрымі прыкладамі, мы маем шмат адмоўных.

У ВСНГ — сацсумяшчальніку даручылі падлік ведамасьцяй. Перад работніцай фармазаводу — сацсумяшчальніцай у Наркамахове здароўя навалілі цэлыя ворахі папер і абежжнікаў. Сацсумяшчальнікі ў НКПраны ня ведалі, з чаго ім пачаць і як прыступіць да работы, бо ніякай дапамогі і кіраўніцтва яны не атрымлівалі.

Зразумела, што ЦК, ЦКК і ЦСПСБ не маглі ўнікнуць расцяніць падобныя агідныя адносіны да справы сацсумяшчальнасьці, як «упартае супрацьўленьне клясавага ворага, бюракрата, чыноўніка, апартуніста, якія ня могуць мірыцца з прыходам у апарат новых атрадаў ударнікаў».

З боку некаторых прадпрыемстваў таксама назіралася апартуністычная недаацэнка шэфства і сацсумяшчальнасьці. Так, фабрыка «Камунарка» (Менск), ня гледзячы на шматразовыя просьбы падшэфнай канторы Саюзхлеба, ня вылучае сацсумяшчальнікаў. Партячэйкі і фабкомы тых прадпрыемстваў, рабочыя якіх фактычна працавалі сацсаўмяшчальнікамі, не аказвалі ім дастатковага падтрыманьня і дапамогі, не зацікаўлівалі іх дакладаў аб рабоце, ня цікавіліся іх становішчам.

З падборам сацсумяшчальнікаў далёка ня ўсё абстаіць добра, і ў гэтым моманце некаторыя прадпрыемствы праявілі недапушчальную фармальнасьць. Завод імя Варапылава (Менск) вылучыў сацсумяшчальнікам былога гандляра, які на заводзе працуе ўсяго 5 мес. на эльводзе (Менск)—вылучан бронь-вучань. На абутковай фабрыцы (Менск) — сацсумяшчальнікам «дадзен» сам сакратар партячэйкі.

І, нарэшце, з боку ўсіх сацсумяшчальнікаў ідуць заявы аб тым, што ніводнага з іх не аслабанілі ад іншых нагрузак. Ёсьць, нават, яшчэ «усердие» у другі бок: сацсаўмяшчальнік старшыні Вярхоўнага суда тав. Савін гаворыць, што ён да сацсумяшчальнасьці «меў на прадпрыемстве дзьве нагрузкі, а як стаў сацсаўмяшчальнікам—далі яшчэ дзьве новых нагрузкі».

Такія адносіны да ўдарнікаў рабочых, якія добраахвотна ў вольны час ідуць у дзяржаўны апарат, каб і там актыўна, і непасрэдна прымаць удзел у будаўніцтве сацыялізму—ёсьць нішто іншае, як глушэньне іх ініцыятывы.

ЦК, ЦКК і ЦСПСБ на падставе выдадзенай праверкі далі свае часова дырэктыву мясцовым, партыйным, савецкім, прафсаюзным і камсамольскім арганізацыям аб разгортваньні сацыялістычнага сумяшчэньня ў БССР, паказаўшы цэлы рад канкрэтных задач, выканаць якія абавязаны мясцовыя арганізацыі.

Да ліку гэтых задач адносяцца:

уважлівы адбор сацсумяшчальнікаў з лепшых рабочых - ударнікаў (на прыцыпе добраахвотнасьці); вызваленьне сацсумяшчальнікаў ад усялякай грамадзкай нагрузкі на прадпрыемстве; штодзённая дапамога ім у рабоце; складаньне з кожным сацсумяшчальнікам плянаў яго работы; дакладнае вы значэньне функцый, правоў і абавязкаў сацсумяшчальніка; змаганьне з усялякімі спробамі скажэньня ідэі сацсумяшчаньня ў выглядзе даручэньня сацсумяшчальнікам тэхнічнай работы, перакладаньне на іх адразу ўсёй ад казнасьці і г. д.; дапамога ім па аўладаньні тэхнікай работы данай ўстановы і інш.

Мясцовыя арганізацыі павінны папулярызаваць і поўнасьцю выканаць дырэктывы партыі аб разгортваньні сацсумяшчэньня.

Гэтаму важнейшаму віду ўцягненьня рабочых у кіраўніцтва дзяржавай неабходна аддаць найбольшую ўвагу і штодзённую канкрэтную дапамогу—кіраўніцтва.

Трэба спыніцца і на другой форме ўцягненьня мас у непасрэдную работу апарату — гэта арганізацыя грамадзкіх інспэктараў і інструктараў. Гэты інстытут грамадзкіх работнікаў апарату ўжо доўгі час з посьпехам ужываецца органамі КК-РСІ.

Практыка паказала поўную жыцьцёвасьць і карысьнасьць гэтай формы ўцягненьня мас, і таму па дырэктыве ЦК, ЦКК і ЦСПСБ яна таксама патрэбуе большай увагі і большага ўжываньня.

Х. Ж.

Парыцкі райспажы саюз зрывае ліквідацыю няпісьменнасьці

Ужо два месяцы як пачаўся навучальны год. Між тым, у галіне ліквідацыі няпісьменнасьці ў Парыцкім раёне работа амаль не пачыналася. Мясцовыя арганізацыі не займаюцца гэтым вельмі важным пытаньнем. Напрыклад, Парыцкі райспажыўсаюз дагэтуль не паклапаціўся аб тым, каб забясьпечыць школы і ліквпункты газай. Асабліва кепска справа ў сельсаветах (Давыдаўскі і Людзьвінаўскі), у якіх школы і ліквпункты сядзяць ужо другі месяц без газы, дзякуючы чаму зрываецца работа.

Райінспэктарыят асьветы, райспажыўсаюз і іншыя арганізацыі, ніякіх захадаў ня прымаюць. Трэба неадкладна зьвярнуць усе недахопы і работу ліквпунктаў пусьціць на поўны ход.

В. Р.

Літаратурная выстаўка МенАПП

6 лістапада г. г. у Доме Пісьменьніка адкрыта Першая літаратурная выстаўка ў ССР. Выстаўка арганізавана Менскай Асацыяцыяй пралетарскіх пісьменьнікаў да 1 канфэрэнцыі МенАПП-у. Мэта, пастаўленая МенАПП-ам пры арганізацыі выстаўкі — паказ барацьбы пралетарскай літаратуры на франтох сацыялістычнага будаўніцтва. Лёзунгі выстаўкі—літаратура на службу сацыялістычнаму будаўніцтву, за культуру сацыялістычную па зьмесьце і нацыянальную па форме, за вялікае мастацтва бальшавізму.

Выстаўка складаецца з наступных аддзелаў: ударнік ідзе ў літаратуру; праца пісьменьніцкіх брыгад на прадпрыемствах і ў калгасах БССР і СССР; аддзел да 10-годзьдзя літаратурнай дзейнасьці пралетарскага паэты Андрэя Александровіча; мастацкая літаратура за 1931 г. (аддзел ДВБ); аддзел барацьбы з контрэвалюцыйным нацыянал - дэмакратызмам у БССР; літаратура ў Заходняй Беларусі. Такім чынам, выстаўка складаецца з 6 аддзелаў. Спынімся кароткі на кожным з іх.

Ударнік ідзе ў літаратуру

Аддзел «Ударнік ідзе ў літаратуру» паказвае першыя вынікі работы Менскай Асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў па закліку рабочых - ударнікаў у літаратуру на буйных прадпрыемствах Менску. Пачынаецца аддзел адозвай Сакратарыяту БелАПП-у і ЦСПСБ аб закліку ўдарнікаў у літаратуру, дагаворам паміж Менскім камсамолам і МенАПП-ам. Далей ідуць фатаграфіі рабочых - аўтараў заводу імя Варапылава, заводу «Камунар», «Дрэваапрацоўшчык», друкарні імя Сталіна, фабрыкі «Кастрычнік». У гэтым аддзеле паказана першая кніжка заводу імя Варапылава «Запаведзі». У аддзеле мы бачым рукапісы-вершы, апавяданьні, напісаныя рабочымі - пісьменьнікамі і надрукаваныя ў заводзкім і фабрычным друку, пасобныя моманты з работы літаратурных гурткоў МенАПП-у, літаратурныя старонкі шматтыражак, прысьвечаныя закліку рабочых - ударнікаў у літаратуру. Аддзел «Ударнік ідзе ў літаратуру» канчаецца шчытом, на якім глядач бачыць цэлую масу выразак з розных газэт на розных мовах пад агульным лёзунгам «У інтэрнацыянальна-клясавым адзінстве — ударнік ідзе ў літаратуру».

Усяго па Менску да Першай канфэрэнцыі МенАПП ахоплена ў літаратурных рабочых гурткох звыш 200 рабочых - ударнікаў. Гэта зьяўляецца адным з буйнейшых дасягненьняў Менскай Асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў і сьведчыць аб карэннай перабудове работы арганізацыі, паваротам да выяўленьня і выхаваньня новых кадраў з рабочага асяродзьдзя.

Праца пісьменьніцкіх брыгад

Характарнай адзнакай літаратурнага жыцьця ў 1931 годзе зьяўляецца паварот усіх пісьменьніцкіх арганізацый да непасрэднага ўдзелу ў жыцьці сацыялістычных прадпрыемстваў Савецкай Беларусі, Савецкага Саюзу. За 1931 г. адбылося шмат выязьдаў пісьменьніцкіх брыгад у розныя прамысловыя цэнтры, у калгасы і г. д. Пісьменьніцкія брыгады не гастралявалі, як гэта было ў мінулыя гады, а працавалі ў адным цэнтры, у адным калгасе па месяцу, па два, па тры. У выніку мы маем карысную работу.

Аддзел «Праца пісьменьніцкіх брыгад» пачынаецца з матар'ялаў брыгады: «Шатура — Асінторф», куды выяжджалі пісьменьнікі: Ізя Харык і П. Галавач. На выстаўцы паказаны матар'ялы—вынікі паездкі на Шатуру і Асінторф — урыўкі з паэмы Харыка — «Торф».

Далей, у гэтым-жа аддзеле паказваецца праца БелАПП-аўскай брыгады на дрэваапрацоўчым камбінаце ў Барурыску. У склад брыгады ўваходзілі пісьменьнікі С. Ліхадзіеўскі і Ц. Зарэчны. Брыгада выдавала газэту «На рэчным фронце». Прыгадаем, зьмясьціла рад дапамагала рэдкалегіяльным друку, барацьбе за ліквідацыю... ударнікаў камбінату, ... зунгі і інш. матар'ялы.

... пісьменьніцкіх ... арганізацыям ... пралетарска... зуе работу пісьменьніцкай брыгады. «Праца пісьменьніцкай брыгады» на папяровай фабрыцы «Герой працы» у Добрушы, прадстаўлена работай у шматтыражцы «Чырвоная бракамолка», друкаванай газэтай «За паперу». Цікавым вопытам работы, які быў праведзены брыгадай, на выстаўцы паказаны лёзунгі для машын, напісаныя пісьменьнікамі. З усёй масы лёзунгаў прадстаўлены два. Першы лёзунг—для машыны ўдарніка: «Гэта машына пакрыла заданьне, Вось дзе працуе лепшы ўдарнік.»

Другі-ж лёзунг прысьвечаны машыне прагульшчыка:

«Вось прамфінпляну стаіць недагрузчык,
На гэтай машыне ўдарны прагульшчык».

Лёзунгі рабілі сваю справу. Брыгада з гонарам справілася з сваёй работай, дапамагла мясцовым арганізацыям у ліквідацыі прарываў і атрымала зарадку для сваёй творчасьці. Пісьменьнік Пятрусь Броўка напісаў аповесьць «Каландры». Ц. Доўгапольскі, у выніку паездкі на Добрушь, напісаў п'есу «Папера», якая прынята да пастаноўкі ў БДТ-1.

Брыгада «Сельмаш-Гомель» прадстаўлена матар'ялямі Я. Скрыгана і З. Паваротнага. Сэрыя нарысаў, вынесіка з пастановы бюро партыйнага калектыву Гомсельмашу пра работу брыгады, рукапісы пра героя Сельмашу, загад па рэдакцыі «Зьвязда», які гаворыць аб тым, што «брыгада БелАПП правяла вялікую арганізацыйную работу на - масавую і апэрацыйную работу на прадпрыемстве, умела падышоўшы да пытаньняў барацьбы з важнейшымі мабілізаваць рабочых калектыў і заводзкія арганізацыі вакол барацьбы за прамфінпляны. За карысную работу брыгада БелАПП узнагароджана рэдакцыяй газэты «Зьвязда» прэміяй на 100 руб. кожнаму, апрача агульных разрахункаў.

... рабочых ... арганізацыям ...

10-годзьдзе літаратурнай дзейнасьці А. Александровіча

На выстаўцы вызначана ў спэцыяльны ...

прысьвечаныя паказу герояў пяцігодкі. Трэба адзначыць вельмі малы лік матар'ялаў, які характарызуе работу яўрэйскай сэкцыі БелАПП.

Далей — работа пісьменьнікаў у калгасах і саўгасах. Паказана работа пісьменьніцкай брыгады ў калгасе «Бальшавік», Капыльскага раёну, (Баранавых і Сташэўскі), работа брыгады пісьменьнікаў у сьвінагадоўчым саўгасе Банань, Полацкага раёну, (Крапіва і Ліпнёвы). Найбольш поўна паказана работа брыгады ў саўгасе Банань, якая выдавала газэту «Зьвязда за сацыялістычную сьвінагадоўлю». Паказана на выстаўцы работа брыгады, якая выяжджала ў Віцебск для дапамогі ў правядзеньні дэкадніку беларускай пралетарскай культуры. Брыгада правяла рад літаратурных вечароў на прадпрыемствах Віцебску, дапамагла Віцебскай Асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў у арганізацыі рабочых літаратурных гурткоў, выдала 4 літаратурных старонкі ў газэце «Віцебскі пралетары». Пастанова гаркому КП(б)Б аб работе брыгады гаворыць, —«Брыгада садзейнічала папуляризацыі сярод рабочых дасягненьняў партыі ў правядзеньні нацыянальнай палітыкі, а літаратурныя вечары паказалі вялікую зацікаўленасьць рабочых да беларускай пралетарскай літаратуры.

Члены Менскай Асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў, як відаць ужо з папярэдніх аддзелаў на выстаўцы, працавалі ня толькі на прадпрыемствах БССР. На выстаўцы паказана работа пісьменьніцкай брыгады ва Ўзбэкіста не, якая выязджала ў Сярэднюю Азію па даручэньні газэты «Известия ЦИК СССР и РСФСР» з мэтаю праверкі падрыхтаванасьці бавоўняных раёнаў Узбэкістану да ўборачнай кампаніі. Брыгада апроч непасрэдных заданьняў «Известий» правяла вялікую работу па папулярызацыі пралетарскай літаратуры народаў Савецкага Саюзу. На выстаўцы паказана работа брыгады ў Ташкенце, Самаркандзе, Бухары, Маргелане і Фэргане.

На гэтым канчаецца аддзел «Праца пісьменьніцкіх брыгад».

Літаратура Заходняй Беларусі

Літаратура Заходняй Беларусі на выстаўцы прадстаўлена асобным аддзелам, які ў сваю чаргу паказ... ...ратура; фашысцкая літаратура. Спынімся пасобна на кожным з п-аддзелаў.

Краты. З-за крат глядзяць фатаграфіі Акадэміка Тарашкевіча, Дварчаніна, Мятлы, Валошына, Грэскага, С. Рак-Міхайлоўскага і інш. таварышоў, якія сядзелі ў польскіх фашысцкіх турмах, некаторыя з якіх і цяпер знаходзяцца ў засьценках белай Польшчы. Тут прадстаўлена прэса — выданьні ЦК МОПР-у Заходняй Беларусі — ад наднёўкі «Турмы клічуць да барацьбы», «Чырвоная дапамога», «МОПР» —турэмны часопіс на гектографе.

Радыкальная літаратура паказана гектаграфаванымі вучнёўскімі часопісамі Віленскай беларускай гімназіі, газэтамі, прафсаюзнымі часопісамі.

Падпольная літаратура паказана прэсай ЦК КПЗБ і ЦК КСМЗБ, с

ТРЭЦЯЯ ПЯЦІДЗЕНКА ЛІСТАПАДА

дала зьніжэньне тэмпаў збожжазагатовак

Ачысьціць загатоўчы апарат ад бюракратаў, апартуністаў і шкоднікаў, якія зрываюць пасьпяховае правядзеньне збожжазагатоўчай кампаніі

Выкананьне гадавога пляну

На 6 лістапада	На 11 лістапада	На 16 лістапада
46,2 проц.	51,3 проц.	54,0 проц.

Зводка аб выкананьні пляну збожжазагатовак па БССР на 16 лістапада

У проц. да гадавога пляну

Па сыстэме Белкаапсаюзу:

Аршанскі	72,1
Асьвейскі	116,1
Бабруйскі	70,6
Бешанковіцкі	94,2
Бялыніцкі	52,2
Віцебскі	70,4
Вушацкі	61,6
Гарадоцкі	93,6
Горацкі	70,1
Гомельскі	107,8
Дрысенскі	—
Дуброўніцкі	72,4
Крупскі	53,2
Койданаўскі	43,5
Лёзьнінскі	82,2
Менскі	59,2
Магілеўскі	51,5
Мсьціслаўскі	78,1
Полацкі	58,0
Расонскі	62,7
Сеньненскі	75,7
Сіроцінскі	85,3
Сураскі	124,8
Талочынскі	69,5
Чавускі	41,0
Чашніцкі	55,0
Шклоўскі	56,2

Па сыстэме Белкаапсаюзу галавы плян збожжазагатовак выкананы на 66,1 п. оц.

Па сыстэме Белхлебжывсаюзу:

Аспаўскі	54,7
Барысаўскі	53,5
Бегомльскі	44,5
Буйнічскі	42,1
Быхаўскі	44,1
Гомельскі	55,1
Брэгінскі	62,9
Веткаўскі	53,5
Глускі	53,9
Жлобінскі	49,5
Жыткавіцкі	63,0
Заслаўскі	76,5
Камарынскі	41,6
Кармянскі	56,5
Каралінскі	62,7
Касьцюковіцкі	49,8
Клімавіцкі	55,0
Капыльскі	35,4
Краснапольскі	49,9
Крычаўскі	69,7
Лагойскі	59,8
Лельчыцкі	25,6
Лоеўскі	46,0
Любанскі	36,9
Мазырскі	36,5
Нароўлянскі	78,4
Парахіцкі	58,8
Плешчаніцкі	79,5
Прапойскі	37,0
Пухавіцкі	43,3
Петрыкаўскі	38,6
Рагачоўскі	45,3
Рэчыцкі	43,5
Слуцкі	33,9
Смалявіцкі	52,8
Стара-Дарожскі	22,4
Старобінскі	38,7
Тураўскі	40,5
Ушачскі	87,5
Вялікасенскі	52,7
Хойніцкі	47,2
Церахаўскі	59,0
Чачэрскі	46,0
Чырвонаармейскі	51,6
Чэрвеньскі	50,1
Чэрыкаўскі	77,7

Усяго па сыстэме Белхлебжывсаюзу гад вы плян збожжазагатовак выкананы на 49,2 проц.

Усяго па БССР галавы плян збожжазагатовак на 16 лістапада выкананы на 55,4 проц.

„Я ўсё роўна под судом"...

Полацак. (Наш кар.). У дні сьвяткаваньня XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі калгас «Беларуская вёска», Дамінікоўскага сельсавету, Полацкага раёну, арганізаваў чырвоны абоз са збожжам на Палатоўскую базу Полацкага райкаапсаюзу. Калі чырвоны абоз прыбыў на базу, загадчык базы адмовіўся прыняць збожжа.

— Мы загатаўляем толькі гародніну, садовіну і тэхкультуры, а збожжа вязеце ў сельспажыўтаварыства.

Чырвоны абоз, па непраразнай, асеньняй гразі накіраваўся ў бліжэйшае сельспажыўтаварыства, аднак і там збожжа адмовіліся прыняць. Старшыня сельспажыўтаварыства Лашкоў сустрэў чырвоны абоз з такой заявай:

— Мы прымаем чырвоныя абозы толькі са свайго сельсавету—Юравіцкага, а вы Дамінікоўскага сельсавету—ну і вязеце збожжа ў сваё сельспажыўтаварыства.

Зрабіўшы некалькі дзесяткаў кілёмэтраў, чырвоны абоз вымушаны быў зьвярнуцца ў калгас ня здаўшы збожжа, бо надышла ноч.

Такія адносіны старшыні Юравіцкага сельспажыўтаварыства Лашкова зьяўляюцца ня толькі галаваціпскімі, —гэта сьвядомае шкодніцтва, манэўр клясавага ворага, накіраваны на зрыў збожжазагатовак. Гэта сьцьвярджаецца яшчэ і наступным фактам: Лашкоў ссыпае ў адно месца гатунковае і звычайнае збожжа і калі калгасьнікі заўважылі яму на недапушчальнасьць такой «работы» Лашкоў адказаў:

— Я ўсё роўна пад судом і ўсё роўна адна кара будзе.

Будзе «адна кара»—значыцца трэба скарыстаць момант для таго, каб яшчэ больш нашкодзіць — вось погляды Лашкова. Чакаючы «кары» Лашкоў ім кнецца яшчэ больш пашырыць сваё шкодніцтва.

Але Лашкоў памыляецца. Кара будзе не адна. Судова-сьледчыя і адміністрацыйныя органы Полаччыны павінны прыняць і прымуць тэрміновыя меры да таго, каб своячасова ізаляваць і прыцягнуць да адпаведнай адказнасьці шкодніка.

Я. Зорны.

Падхапіць баявыя прыклады калгасаў „Чырвоная Ніва" і „Перамога"

ПОЛАЦК (наш кар.). Збожжазагатоўкі ў паасобных калгасах Полаччыны праходзяць ганебна-маруднымі тэмпамі. Рад калгасаў яшчэ толькі пачынаюць здачу збожжа, напрыклад, калгас імя Леніна, Хацкага сельсавету, «Усходы Леніна», Салоніцкага сельсавету, калгас «Пралетары» Наўліцкага сельсавету і інш. У калгасе «Пралетары» падкулачнікі Будзько П. і Шарах А. пралезьлі ў камісію садзейнічаньня загатоўкамі і карыстаючыся гэтым, тармозяць ход загатовак.

У практыцы збожжазагатовак яшчэ не ліквідаваны месьніцкія тэндэнцыі. Так, старшыня калгасу імя Сталіна № 1, Мала-Сітнянскага сельсавету Дзюбанаў заяўляе: «здай ім (?) хлеб, а потым прасі, зьняўшы шапку», а старшыня калгасу «Ленінскі шлях», Шлейвіс, на прапанову калгасьнікаў-ўдарнікаў здаць у першую чаргу загатоўкі дзяржаве, заявіў: «менш вы глядзеце і выконвайце гэтыя загатоўкі». На 10 лістапада гэтым калгасам ня было здана ніводнага цэнтнера бульбы па загатоўках.

У вёсках Забалоцьце і Нагіршчына Громаўскага сельсавету, нічога апрача «рэзалюцый» сельсаветам не загатоўлена. Кулацка-заможная частка гэтай вёскі яўна ўхіляецца ад выканаьня загатовак і агітуе беднякоў і сераднякоў адмаасобнікаў і нават калгасьнікаў за зрыў загатовак. Сельсавет зусім не клапоціцца аб тым, каб своячасова выканаць пляны загатовак.

Між тым перадавыя калгасы і сельсаветы паказалі баявыя прыклады выканаьня загатоўчых пляноў. Так, напрыклад, напярэдадні Кастрычніцкіх сьвят калгасьнікі калгасу «Чырвоная ніва», Шпакоўщынскага сельсавету, арганізавалі ў падарунак XIV Кастрычніку чырвоны абоз са збожжам. Апрача гэтага 19 калгасьнікаў абавязаліся, з сваіх асабістых прыбыткаў добраахвотна здаць дзяржаве ў парадку загатовак таварныя лішкі. Лічба, якую вызначылі калгасьнікі па здачы лішкаў збожжа дзяржаве, складае каля 7 тон жыта, 3,5 цэнт. ячменю і 1 тону аўсу.

Калгасьнікі калгасу «Перамога» Громаўскага сельсавету 7-га лістапада арганізавалі чырвоны абоз, якім здалі заданьне па загатоўках і ўнесьлі датэрмінова ўзносы на пазыку «3-га рашаючага году».

Баявыя прыклады гэтых калгасаў павінны быць падхоплены ўсімі сельсаветамі і калгасамі Полаччыны.

Якім Зорны.

Плян збожжазагатовак перавыкананы

Перавыканалі гадавыя пляны збожжазагатовак калгасы Сьвяцкага сельсавету, Рагачоўскага раёну. Гэтых посьпехаў калгасы дасягнулі ў выніку шырока разгорнутай палітычна-масавай работы вакол збожжазагатовак.

Ян Клімовіч.

Па БССР

У Менск вярнулася група рабочых-ўдарнікаў харчавікоў, якія езьдзілі ў экскурсію ў Ленінград для азнаямленьня з пастаноўкай работы на буйных хлебапякарных і цукерачных прадпрыемствах.

Ударнікі наведалі 6-ты хлебазаводаўтамат, вучэбныя камбінаты цукерачнай прамысловасьці і цукерачную фабрыку імя Самойлавай.

Асаблівае ўражаньне на курсантаў зрабіў хлеба-завод-аўтамат і яго лябараторыя.

Лябараторыя прымае самы актыўны прыкметны ўдзел у палепшаньні якасьці хлеба. Работнікі лябараторыі абязьцілі сябе ўдарнымі і прымацаваны да пэўнай брыгады рабочых. На заводзе ўжываецца зьменна-суткрэчнае плянаваньне.

Менскія харчавікі высоўваюць пытаньне аб арганізацыі абмену вопытам з ленінградзкімі прадпрыемствамі, шляхам арганізацыі экскурсій, пры посылцы матар'ялу і г. д.

* * *

Згодна загаду тав. Мікаяна, маргары навы завод у Гомлі павінен быць пушчаны 1-га сьнежня. Але сканчэньне пабудовы затрымліваецца з-за не дахопу некаторых будматар'ялаў, асабліва цэменту і неатрыманьня абсталяваньня.

Наркамснаб Беларусі прыняў рад захадаў па фарсаваньні адпрузкі матар'ялу для маргарынавага заводу.

* * *

Цэнтраархіў Беларусі пачынае з 1-га студзеня 1932 году выдаваць часопіс «Архіў Савецкай Беларусі», у якім будуць друкавацца, галоўным чынам, матар'ялы, якія да гэтага часу не апублікаваны.

У год будзе выходзіць 4 нумары.

Першы нумар будзе прысьвечаны 1917 году. Для часопісу ўжо ёсьць вельмі каштоўны матар'ял аб польскай акупацыі.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

пра назначэньне тав. ЛЯХАВА В. А. намесьнікам народнага камісара фінансаў БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Назначыць тав. Ляхава, Віктара Аляксандравіча, Намесьнікам Народнага Камісара Фінансаў БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гнілякевіч.**
17 лістапада 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб аслабаненьні тав. ГЕРШЭЛЬМАНА Э. Я. ад абавязкаў Дырэктара Інстытуту савецкага будаўніцтва і права.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

У сувязі з пераходам тав. Гершэльмана, Эдуарда Яўгенавіча, на іншую работу, аслабаніць яго ад абавязкаў Дырэктара Інстытуту савецкага будаўніцтва і права пры Прэзыдыуме ЦВК БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гнілякевіч.**
17 лістапада 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

пра назначэньне тав. ГОХМАНА С. М. Дырэктарам Інстытуту савецкага будаўніцтва і права.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Назначыць тав. Гохмана, Станіслава Маркавіча, Дырэктарам Інстытуту савецкага будаўніцтва і права пры Прэзыдыуме ЦВК БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гнілякевіч.**
17 лістапада 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

пра назначэньне тав. ГАНТМАНА В. Р. Намесьнікам Старшыні Нацыянальнай Камісіі ЦВК БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Назначыць тав. Гантмана, Веніяміна Раманавіча, Намесьнікам Старшыні Нацыянальнай Камісіі ЦВК БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гнілякевіч.**
17 лістапада 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

пра назначэньне тав. ДУКЕЛЬСКАГА С. С. Намесьнікам Старшыні Дзяржаўнай Палітычнай Управы БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Назначыць тав. Дукельскага, Сямёна Сямёнавіча, Намесьнікам Старшыні Дзяржаўнай Палітычнай Управы БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гнілякевіч.**
17 лістапада 1931 г.
г. Менск.

У Крупках перавыбары ФЗМК правальваюцца

У Крупскім раёне сарвана работа па перавыбарах фабзаўмясцкомаў. Райпрафсаветам ня было праведзена падрыхтоўчай работы ў сувязі з адыходам у водпуск старшыні і яго намесьніка.

Вінаватых у зрыве перавыбарчай кампаніі прыцягнуць да адказнасьці.

Я. Добры.

Пра высяленьне з кватэр у адміністрацыйным парадку

Арт. 174 Грамадзянскага Кодэксу дае цьвёрдае паказаньне аб тым, што высяленьне з кватэр у адміністрацыйным парадку можа рабіцца толькі ў тых выпадках, якія дакладна паказаны ў спэцыяльных законах.

Аснаўным такім законам, якім прадугледжаюцца выпадкі, калі дапушчаецца адміністрацыйнае высяленьне, зьяўляецца пастанова ЦВК і СНК БССР ад 19 лютага 1927 г. «Аб умовах і парадку высяленьня грамадзян з занятых імі памяшканьняў у гор. і мястэчках». (Зб. Зак. БССР 1927 г., № 12, арт. 42). Гэтая пастанова з моманту яе апублікаваньня шмат разоў зьмянялася і дапаўнялася, прычым пастановы пра гэтыя зьмены і дапаўненьні раскіданы ў розных нумарах Зоору закону за апошнія 4 гады. Апрача таго, і ўрадам Саюзу ССР, і Урадам БССР выдадзены яшчэ паасобныя пастановы, якімі прадугледжваюцца выпадкі, калі дазваляецца адміністрацыйнае высяленьне.

Карыстаньне ўсім гэтым матар'ялам досыць цяжка. Для палягчэньня адшуканьня па пастаўленым пытаньні належных законаў і складзена наступная даведка.

Усе выпадкі, калі згодна розных спэцыяльных законаў дапушчаецца адміністрацыйнае высяленьне, можна падзяліць на наступныя групы:

I. Пасьпны быць высялены ў адміністрацыйным парадку з муніцыпалізаваных дамоў, якія эксплёатуюцца беспасрэдна камунальнымі аддзеламі, альбо пераданы ЖАКТ'ам, і з камунальнага фонду ў прыватных дамох асобы непрацоўных катэгорый—на падставе арт. 8-а пастановы СНК БССР «Пра мерапрыемствы па жыльлёвай гаспадарцы» (ў рэдакцыі пастановы СНК БССР за 2-III—1930 г.—Зб. Зак. БССР 1930 г. № 15. п. 107).

Высяленьне робіцца ў парадку, які прадугледжан арт. арт. 4 і 5 пастановы ЦВК і СНК БССР за 19-II--1927 г. «Аб умовах і парадку высяленьня грамадзян з занятых імі памяшканьняў у гарадох і мястэчках» (гл. Зб. Зак. БССР 1928 г. № 35, п. 324 і 1930 г. № 6, п. 38).

II. У тым-жа адміністрацыйным парадку можа рабіцца высяленьне ў выпадках, паказаных у арт. 2 пастановы ЦВК і СНК БССР за 19-II—27 г. «Аб умовах і парадку высяленьня грамадзян з занятых імі памяшканьняў у гарадох і мястэчках» (Зб. Зак. БССР 1927 г. № 12, арт. 42 і 1928 г. № 15, арт. 124 і)), г. зн. у наступных выпадках:

а) з дамоў, якія замацаваны пастановамі ЦВК альбо СНК за дзяржаўнымі ўстановамі і прадпрыемствамі, прафэсыянальнымі і партыйнымі арганізацыямі, калі памяшканьне патрэбна ім для службовых мэт;

б) з дамоў, якія ўваходзяць у камунальны жыльлёвы фонд і замацаваны пастановамі акруговых выканаўчых камітэтаў, гарадзкіх альбо местачковых саветаў, да выданьня гэтай пастановы за дзяржаўнымі ўстановамі і прадпрыемствамі, прафэсыянальнымі і партыйнымі арганізацыямі, калі памяшканьне патрэбна ім для службовых мэт;

в) з памяшканьняў, якія ўваходзяць у камунальны жыльлёвы фонд, а таксама з жылой плошчы ў прыватных домаўладаньнях, якая лічыцца ў камунальным фондзе, калі яны заняты без дазволу кіраўніцтва дамамі, аддзелу камунальнае гаспадаркі, альбо замяняючага яго органу;

г) з напражаючых абвалам дамоў да каго-б яны не належылі ў выпадках, калі тэрмінова трэба раскідаць альбо адрамантаваць той ці іншы дом.

д) з памяшканьняў у гасьцініцах, якія здаюцца на суткі, пасьля 14-ці дзён пражываньня ў іх жыльца, калі асобаю ўмоваю гэты тэрмін ня быў працягнуты;

е) з памяшканьняў, якія здаюцца рабочым і служачым пры наймальні на сэзонную работу,—праз 3 дні пасьля сканчэньня работы, калі з імі зроблены канчатковы разрахунак;

ж) з кватэры, якія даюцца наймальнікам, дамовым работнікам, праз 14 дзён пасьля скасаваньня дагавору найму мальнікам;

з) з агульных памяшканьняў і інтэрнатаў пры школах, пасьля таго, як асобы, якія пражываюць у гэтых памяшканьнях, скончыць курс навукі, альбо выйдуць па іншай прычыне з даных школы, праз 1 месяц ад моманту, калі жылец страціць сувязь са школай;

і) з памяшканьняў, якія даюцца ўстановамі і прадпрыемствамі сваім супрацоўнікам—праз два месяцы ад моманту, калі жылец страціў сувязь з даным месцам службы;

к) з казарменных памяшканьняў—асоб, якія не знаходзяцца на службе ў РСЧА альбо ва ўстановах НК Ваен.-М.-Спраў, а таксама з дамоў, замацаваных за органамі НК. Ваен.-М. Спраў,—асоб, якія не знаходзяцца на службе ў РСЧА, апроч сем'яў кадравага начальніцкага складу;

л) з памяшканьняў транспарту;

м) з агульных памяшканьняў і дамоў для беспрацоўных праз месяц пасьля таго, як беспрацоўны дастане работу, альбо пасьля трох месяцаў прабываньня беспрацоўнага ў агульным памяшканьні альбо ў доме для беспрацоўных.

Пры гэтым, высяленьне з памяшканьняў органаў транспарту робіцца паводле прадпісаньня пастановы ЦВК і СНК Саюзу ССР за 13-II—1931 г. «Пра высяленьне з памяшканьняў органаў транспарту чужых транспарту асоб, і пра перасяленьне работнікаў транспарту» (Зб. Зак. СССР 1931 г., № 10, арт. 110—гл. таксама Зб. Зак: БССР 1931 г. № 21, п. 165 і Зб. Зак. Саюзу ССР 1931 г. № 58, арт. 376).

Высяленьне з дамоў, якія належаць Народнаму Камісарыяту па Ваенным і Марскіх Справах рэгулюцца дзьвюма пастановамі:

1) ЦВК і СНК БССР ад 17-VIII 1931 г. «О выселении из домов, принадлежащих Народному Комиссариату по Военным и Морским Делам лиц, не состоящих в рядах РККА» (Зб. Зак Саюзу ССР 1931 г. № 53, п. 342 і

2) ЦВК і СНК БССР за 1-IX 1931 г. «Пра высяленьне з дамоў НКВ. Спр.» («Сав. Бел.», № 206).

III. Органам ВСНГ Саюзу ССР і ВСНГ саюзных рэспублік надаецца права высяляць у адміністрацыйным парадку ва ўсякі час году з памяшканьняў, якія знаходзяцца на тэрыторыі прадпрыемстваў дзяржаўнае прамысловасьці, якая мае абаронае значэньне, асоб, ня маючых альбо страціўшых сувязь з даным прадпрыемствам.

Высяленьне ў гэтых выпадках рэгулюецца правіламі пастановы ЦВК і СНК Саюзу ССР за 13-IX 1931 г. «О выселении из помещений, находящихся на территории предприятий со государственной промышленности, имеющей оборонное значение (Соб. Зак. СССР 1931 г., № 60, арт. 387) і пастановы ЦВК і СНК БССР за 24-XI 1931 г. пра высяленьне з памяшканьняў, якія знаходзяцца на тэрыторыі прадпрыемстваў дзяржаўнай прамысловасьці, што маюць абаронае значэньне. («С. Б.», № 254).

IV. У адміністрацыйным-жа парадку павінны быць высялены з жылых памяшканьняў, якія знаходзяцца на тэрыторыі дзяржаўных прадпрыемстваў і складаў, ахоўваемых ваеннай ці ваенізаванай вартай, асобы, якія не працуюць у гэтых прадпрыемствах, будынках((гл. Зб. Зак. Саюзу ССР 1927 г., № 33, арт. 344).

У тым-жа парадку робіцца высяленьне і з нафтавых складаў Нафтасыньдыкату, якія не падлягаюць ахоўваньню ваенізаванай вартай (гл. Зб. Зак. СССР 1928 г., № 57, арт. 502).

V. У адміністрацыйным парадку на падставе арт. VI пастановы СНК БССР «Пра мерапрыемствы па жыльлёвай гаспадарцы» (Зб. Зак. БССР 1928 г. № 19, арт. 192) высяляецца пасьля сканчэньня тэрміну дагавору жыльца памяшканьняў, якія ўваходзяць у мануўраны фонд, а таксама памяшканьняў, якія знаходзяцца пад ведамам прадпрыемства прамысловасьці і транспарту і якія здадзены жыльцам паводле асобных дагавораў (гл. а) пастанову СНК Саюзу ССР за 20-VIII 1928 г. «об основаниях сдачи в наем жилых помещений в домах, принадлежащих государственным, промышленным и транспортным предприятиям»—Соб. Зак. СССР 1928 г., № 54, ст. 487 і б) пастанова СНК БССР за 8-IV 1928 г. «Пра аддачу ў наймы жылых памяшканьняў ў дамох, якія належаць дзяржаўным, прамысловым і транспартным прадпрыемствам»—(З. З. БССР 1929 г. № 13, п. 66).

VI. Урэшце, у адміністрацыйным-жа парадку робіцца высяленьне з памяшканьня, права на якое было захавана за пераведзеным работнікам на падставе пастановы СНК Саюзу ССР за 18-VI 1931 г., № 467 «Пра льготы для работнікаў, якія пераводзяцца загадам органаў працы (Зб. Зак. СССР 1931 г., № 38, арт. 273), калі скончыўся тэрмін на які памяшканьне было здадзена альбо, калі такое памяшканьне не было занята самавольна, а таксама з памяшканьняў, часова-занятых з прычыны стыхійнага няшчасьця, праз адзін месяц пасьля ўсяленьня, на падставе арт. 12 пастановы ЦВК і СНК БССР за 15-VIII—31 г. «Пра карыстаньне жылой плошчай» (Зб. Зак. БССР, 1931 г., № 38 паст. 235).

Б. Ватацы.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

Гарпраўленьне працасьветы паведамляе настаўнікаў г. Менску, што з 20 лістапада 1931 г. яны будуць прымацоўвацца да закрытага разьмеркавальніка па Савецкай 78.

З 21 лістапада 1931 г. у закрытай сталоўцы, па рагу Савецкай і завулак Луначарскага, усе асьветнікі могуць атрымліваць абеды. Усім МК і прафупаўнаважаным падаць сьпісы ў гарпраўленьне аб ліку асьветнікаў жадаючых карыстацца абедамі.

Гарпраўленьне.

Дом працасьветы 20 лістапада роўна а 6 гадзіне ў пакоі гарпраўленьня саюзу працасьветы, Камуністычная 19, адбудзецца нарада кіраўнікоў вытворчага, культмасавага і сацбытавога сэктару саюзу працасьветы г. Менску разам з адказнымі сакратарамі МК і прафупаўнаважанымі.

Прысутнасьць абавязкова і без спазьненьня.

Культпроп ЦК КП(б)Б паведамляе, што згодна пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б, 1 сьнежня склікаецца Першая Усебеларуская партыйная нарада па мастацтве з наступным парадкам дня:

1. Уступнае слова заг. Культпропу ЦК—т. Чарнушэвіча;

2. Задача мастацтва ў рэканструкцыйны пэрыяд—даклад тав. Плаўца;

3. Аб плане разьвіцьця мастацтва і падрыхтоўцы кадраў—(даклад Галоўмастацтва);

4. Аб становішчы і далейшых задачах разьвіцьця тэатраў у БССР (даклад т.т. Вольскага і Канжоціна);

5. Аб становішчы і далейшых задачах разьвіцьця музыкі, оперы ў БССР (даклад т.т. Гідгарца, Казакова і Любана).

6. Аб выяўленчым мастацтве—дакл. т. Гаўрыленка.

7. Шляхі разьвіцьця кінематаграфіі ў БССР—дакл. т.т. Раманчука і Галкіна.

8. Трамы і самадзейнае мастацтва—даклад т. т. Клімовіча і Шамшуры.

На нарадзе будуць працаваць сэкцыі па асобных галінах мастацтва пры ўдзеле партыйнага і камсамольскага актыву работнікаў мастацтва гор. Менску.

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што ў г. Бабруйску 19 і 20 лістапада і ў г. Жлобіне 21 і 22 лістапада 1931 г. а 10 гадзіне раніцы будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б пад старшынством т. Суханавай.

На ПТ выклікаюцца наступныя таварышы:

На 20-XI (Бабруйск)

1. Магілянскі Г. Я.—Парычы.
2. Гарэлік Н. С.—Парычы.
3. Давідзан В. Х.—Бабруйск.
4. Пятровіч М. П.—Глуск.
5. Адынец П. П.—Глуск.
6. Валодзька У. В.—Глуск.
7. Маршыновіч М. С.—Глуск.
8. Якубёнак К. І.—Глуск.

На 21-XI (у Жлобіне)

1. Курдо М. В.—Жлобін.
2. Кавалёў М. С.—Жлобін.
3. Гайда С.—Жлобін.
4. Шкірман П. І.—Жлобін.
5. Бежэлеў І. М.—Жлобін.
6. Корзун А. П.—Жлобін.
7. Латкоў Ю. Я.—Жлобін.
8. Казлоўскі М. М.—Рагачоў.
9. Ільлёў С. Т.—Быхаў.
10. Куракін Д. П.—Быхаў.
11. Крыкаў Р. П.—Быхаў.

На 22-XI (у г. Жлобіне)

1. Пазьнякоў П.—Быхаў.
2. Янкулін Р. М.—Быхаў.
3. Сясонка Ш. Н.—Быхаў.
4. Катайлаў П. Ф.—Быхаў.
5. Шпаленкоў Я. С.—(Карма)
6. Шарфун Я. І.—Быхаў.
7. Салаўёў А. Я.—Быхаў.
8. Маскалёў Г. М.—Быхаў.
9. Ланкоўскі П. С.—Быхаў.
10. Ізалеўская С. Г.—(Карма).

Пакадана прысутнічаньне сакратароў парт. ячэек, на вучоце якіх знаходзяцца паказаныя таварышы і прад стаўнікі РКК.

Аказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

«ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Пачатак а 6, 8 20; 10-30 кас а 4 г. — Гукавы фільм **Златыя горы** ў 8 частках

КІНОТЭАТР КУЛЬТУРА Пач. а 7 8 45, 10-30. Каса ад 5 г. — Замежны фільм **У сьвеце плянэт і зорак** Звыш праграмы Часопіс Саюзкіно № 63

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Пач. 3-30, 6, 7-30, 9 і 10-30 Каса ад 12 г. — Дастацкі фільм **Сусьветнае імя** Звыш праграмы кіно Карыс № 59

КІНО ПРАЛЕТАРЫ Пачатак а 2 гдзін — Мастацкі баявік **Гандляры славы**

ФОТОАПАРАТ—НА СЛУЖ У САЦ. БУДАЎНІЦТВУ

Кіраўніцтва ашчадкасамі і ДК БССР даводзіць да ведама усіх працоўных, што ашчадкасамі БССР выгвараецца РЭАЛІЗАЦЫЯ ФОТОАБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ, па якіх тымальнікі апошняга змогуць атрымаць фотаапараты тыпу „Фотокор" № 1 разьмерам 9×12 з адпаведнымі прыладамі

КОШТ фотоабавязацель т а: 1, 2, 3 сэрый 220 руб., 4, 5, 6 і 7—187 рублёў.

КОШТ фотоабавязацельства аплачваецца ў растэрм коўку да 1-XII 1933 г. У ЗАЛЕЖНАСЬЦІ АД СЭРЫЙ.

Выдача фотаапаратаў пачынаецца з 1-VII 1932 г. Фотоабавязацельствы будуць рэалізавацца да 1 красавіка 1932 г.

Кіраўніцтва ашчадкасамі і ДК БССР.

ПрыНародным Камісарыяце Камунальнай Гаспадаркі БССР

АРГАНІЗАВАН

Беларускі Філіял Дзярж. Інстытуту здымкі і пляноўкі гарадоў і праектаваньня грамадзянскіх пабудоў

„БЕЛДЗІПРАГАР"

ВЫТВАРАЮЧЫ РАБОТЫ:

1. Топа-геадэзычную здымку насельных месц.
2. Складаньне праектаў пляноўкі і перапляноўкі насельных месц.
3. Складаньне і распрацоўку ўсялякіх праектаў па жыльлёвым, ведамственным, камунальным і ўсіх видах непрамысловага будаўніцтва, а таксама праектаў, паркаў, садоў, сквераў і г. д.

Адрас: Менск, Савецкая, № 46, 4-ты паверх

Дырэктар Белдзіпрагара АГЕЯЎ

Усім дырэктарам і бюро дэпутацкіх груп прадпрыемстваў мясцовай прамыслов сьці і бюро прамысловай сэкцыі Менгарсавету

На 20-га лістапада г. г. а 6-й гадзіне ўв чаны ў памяшканьні Гарсавету (Сэкратарыят)

НАЗНАЧАЕЦЦА НАРАДА

ПА ПЫТАНЬНІ:

Вынікі працы мясцовай прамысловасьці за 10 месяцаў і чарговыя задачы па ліквідацыі прарыву ў выкананьні праграмы году 1931 г.

Прысутнасьць абавязкова і без спазьненьня.

Арг. Маравы Адазея і Інспекцыя Мясцовай Прамысловасьці Менгарсавету

АБ'ЯВА АБ РЭГІСТРАЦЫІ

11-га лістапада 1931 г. Народным Камісарыятам Фінансаў БССР, на падставе артыкулу 2-4 палажэньня аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9-га лютага 1931 г. (Збор Законаў і Загадаў СССР № 8, паст. 99),

ЗАРЭГІСТРАВАНА Ў РЭЕСТРЫ ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБ за № 91

наступнае аб'яднаньне арганізаванае пры Белкаапсаюзе

БЕЛАРУСКАЕ РЭСПУБЛІКАНСКАЕ КАМАНДАНЫЙНАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ ПА АПТОВЫМ ГАНДЛІ ПРАМТАВАРАМІ

МЕСЦА ЗНАХОДЖАНЬНЯ АБ'ЯДНАНЬНЯ, САВЕЦКАЯ, 43-13

Скончыўшыя ў гэтым годзе фізтэхнічнае і прыродазнаўчае аддзяленьні БДУ:

Астапчык Мікола, Дзямідовіч Паўла, Клячкіна Эва, Ляшкевіч Мячыслаў, Партноў Барыс, Рымашэўскі Балеслаў, Шахоцька Ірына, Чабатарэвіч Уладзімір, Чаркашын Леў, Воўкава Людміла, Вараноўская Дора, Івашкевіч Міхась, Каплан Марыя, Манава Маргарыта, Хілімонава Вера, Хэйфец Раман, Шапіра Марыя—

да гэтага часу не прыступілі да працы па прызначэньні НК Асьветы

Частка з іх накіравалася ў іншых установах бяз згоды НКА

У ПОШУКАХ РАЗРАПАНУЕЦЦА

выклікаюцца ім, каб яны зьявіліся ў НКА і атрымаць ПРАЦОЎНЫЯ ПРАПАНОВЫ НА ПРАЦУ

Просьба да кіраўнікоў установаў і прадпрыемстваў зьняць з працы і накіраваць у НКА тых з пералічаных асоб, якія працуюць ва ўстановах без згоды Наркамасьветы

Пом. Наркома Асьветы БССР ПЛАТУН

Вайсковы білет выд. Арлоўскім рудаўпраўленьнем на імя Вайцянкова К., кв. 1120-п.
Вайсковы білет выд. Хоцімскім РВК на імя Баранікова К., кв. 1120-п.
Конская кніжка выд. на імя Івандзікава, кв. 1120-п.
Вайсковы білет выд. Хоцімскім РВК на імя Папова П., кв. 1120-п.
Вайсковы білет выд. Хоцімскім РВК на імя Іванькова А., кв. 1120-п.
Вайсковы білет выд. Хоцімскім РВК на імя Філіпчанка К., кв. 1120-п.
Дасведка выд. Заслаўскім архівам на імя Ужова, кв. 1120-п.
Вайсковы білет выд. Хоцімскім РВК на імя Войценка Г., кв. 1120-п.
Паязная кніжка выд. Хоцімскім сельпо на імя Памучанка П., кв. 1120-п.
Вайсковы білет выд. Хоцімскім РВК на імя Нікіценка І., кв. 1120-п.
Вайсковы білет выд. Хоцімскім РВК на імя Малунова Д., кв. 1120-п.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы прх. Тэлефоны: адказнага рэдактара 7-69, сакратара—4-78, сакратары—6-15. Выдавецтва—2-44. Выпускаючага 12-65 (два званкі)
Падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., 1 год—12 руб. Выхадныя дні 5, 10, 15, 20, 25, 30

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.

Прэзыдэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь